Пролетары ўсіх краёў, злучайцеся!

Зьвязда

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 135 (4039)
ПЯТНІЦА 22 мая
1931 г.
Коштуе нумару 5 коп.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

УЗМАЦНІЦЬ ТЭМПЫ ЗАГАТОВАК АСНОЎНЫХ ВІДАЎ СЕЛЬГАСПРАДУКТАЎ

Тэмпы трэцяга году пяцігодкі раслаюць. Гэты лёзунг усьвядомлен зараз мільёнамі байцоў фронту сацыялістычнай будоўлі. Гэты пёзунг павінен быў пранізаць усю работу загатоўчых сыстэм.

Той факт, што ад вынікаў загатовак сельгаспрадуктаў залежыць паляпшэньне добрабыту рабочай клясы і асноўных мас сялянства, а таксама выкананьне вытворчых заданьняў прамысловасьці, што загатоўкі, як і іншыя мерапрыемствы партыі і ўлады на вёсцы, адбываюцца ва ўмовах абвостранай клясавай барацьбы і выклікаюць шалёнае супраціўленьне кулацкіх элемэнтаў, абавязвае ўсе нізавыя арганізацыі, усе загатоўчыя сыстэмы ўзьняць загатоўкі на ўзровень важнейшага гаспадарча-палітычнага заданьня.

Аднак, ход загатовак асноўных відаў сельгаспрадуктаў у БССР за апошні час сьведчыць, што ўвага да загатовак паслабла, што ў радзе мейсц абмежваліся дасягнутымі посьпехамі, што ў асобных раёнах пануюць дэмабілізацыйныя настроі.

Даюць аб сабе ведаць праваапартуністычныя тэндэнцыі, якія знаходзяць свой адбітак у нежаданьні, у няўменьні ўвязаць усе гаспадарчыя кампаніі, у імкненьні «раскласьці іх па палічках». Праваапартуністычная практыка асабліва яскрава праяўляецца ў пытаньні дачы цьвёрдых заданьняў кулацка-заможнай верхавіне вёскі. Дагэтуль ёсьць яшчэ шмат выпадкаў, калі цьвёрдыя заданьні ня выконваюцца, а сабатажнікі застаюцца непакаранымі, калі няма пільнага кантролю над здачай цьвёрдых заданьняў.

Яскравы прыклад усяму вышэй паказанаму—СЬВІСЛАЦКІ раён. Як правёў ён галоўныя гаспадарча-палітычныя кампаніі?

План ільназагатовак выканан на 17 проц. Кулакі здалі 41 проц. цьвёрдых заданьняў. План збожжазагатовак выканан на 70,7 проц.; кулакі здалі толькі 60 проц. Загатоўлена 70 проц. заданьня па бульбе; кулакі здалі 70,6 проц. і г. д.

Шматлікія карэспандэнцыі рабселькораў, зводкі каапэрацыйных цэнтраў сыгналізуюць аб прарывах у загатоўках.

Больш 6 месяцаў прайшло з таго часу, калі скончыўся апошні тэрмін здачы ЗБОЖЖА. Аднак, дагэтуль БССР не ліквідаваў ганьбу сваёй затазычанасьці па збожжы, здаўшы толькі 83,8 проц. гадовага пляну.

Тав. МОЛАТАЎ у сваёй прамове на 1-й Усесаюзнай канфэрэнцыі работнікаў сацыялістычнай прамысловасьці падкрэсьліў вялізарнае значэньне збожжазагатовак:

«...Нам часта здаецца, што пытаньне аб хлебе не патрабуе да сябе асаблівай увагі. Аднак, гэта было-б памылкай. Забываць аб хлебе, значыць забываць аб уроках нядаўняга мінулага. Бо, калі мы нават не загатовім 10 проц. збожжазагатоўчага пляну, дык гэта складае, прыкладна, такую колькасьць збожжа, якая роўна 150 мін. браніванаму хлебнаму фонду. «Наяўнасьць такога фонду,—падкрэсьліў т. Молатаў,—да пачатку новага сельска-гаспадарчага году зьяўляецца важнейшай умовай усёй нашай гаспадарчай работы. ПАКУЛЬ МЫ НЯ МАЕМ ПОЎНЫХ 100 ПРОЦ. ПЛЯНУ, МЫ НЯ МАЕМ ПЕРШАЙ—Я-Б СКАЗАЎ—АСНОЎНАЙ,—ПРАДПАСЫЛКІ ВЫКАНАНЬНЯ ПЛЯНУ ТРЭЦЯГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ.

Значэньне збожжазагатовак ня ўлічылі: сыстэма Белкаапсаюзу, якая загатовіла толькі 75,8 проц. гадовага пляну; саўгасы, якія здалі толькі 53 проц.; загатоўчыя сыстэмы, якія спагналі 43,3 проц. пляну кантрактацыі. Дагэтуль па аднаасобным сэктары загатоўлена толькі 84,1 проц. пляну.

На БССР ускладзена адказная задача—забясьпечыць БУЛЬБАЙ пралетарскія цэнтры, даць насенную бульбу Ленінградзкай вобласьці і Савецкай Украіне. Ліквідацыя прарываў у пасеўнай кампаніі ў асноўных раёнах Савецкага Саюзу, паляпшэньне рабочага забесьпячэньня чырвоных сталіц, пралетараў Ленінграду і Масквы, якія гэраічна змагаюцца на перадавых пазыцыях сацыялістычнай будоўлі,—ганаровы абавязак Савецкай Беларусі. Значэньне адгрузкі бульбы павінна было быць усьвядомлена кожным нізавым работнікам, кожным калгасьнікам, кожным аднаасобнікам—бедняком і серадняком. Раённыя арганізацыі павінны былі разгарнуць самую шырокую масавую работу вакол адгрузак бульбы, мабілізаваць на гэту справу мільённыя масы працоўнага сялянства. Гэта ня зроблена. У многіх месцах пануе самае агіднае месьніцтва, чапляньне за «ўласную званіцу», хвасьцісцкія настроі.

Замест баявой работы па адгрузцы бульбы наглядаецца ігнараваньне дырэктыў, барацьба за зьмяншэньне пляну. Да 19 мая выканана толькі 19,8 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ, ня гледзячы на тое, што тэрмін адгрузкі насеннай бульбы скончыўся 15 мая.

Поўная бязьдзейнасьць наглядаецца ў ЖЛОБІНСКІМ, ЧЭРЫКАЎСКІМ, СТАРА-ДАРОСКІМ, БЫХАЎСКІМ, СЛУЦКІМ і ПАРЫЦКІМ раёнах. Стара-Дароскі РВК прыняў нават пастанову—хадайнічаць аб зьмяншэньні пляну. Яго прыкладу сьледуюць загатоўчыя арганізацыі, якія лічаць плян нерэальным і ня прымаюць ніякіх мер да адгрузкі.

Трэба раз назаўсёды пакончыць з апартуністычнымі гутаркамі аб зьмяншэньні пляну. Зьніжэньне азначае зрыў забесьпячэньня бульбай пралетарскіх цэнтраў, зрыў засеву палёў Украіны і Ленінградзкай вобласьці.

Трэба адзначыць, што ў радзе месц (ЧАЧЭВІЧЫ, БЫХАЎ, ПАРЫЧЫ) «праспалі» дачу кулаком цьвёрдых заданьняў па бульбе. Гэта недапушчальнае скрыўленьне клясавай лініі павінна быць неадкладна выпраўлена.

Адозва рабочых «Дзьвіны» і Аршанскага ільнакамбінату завастрыла перад масамі калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, перад усімі нізавымі арганізацыямі пытаньне аб ВЫКАНАНЬНІ ПЛЯНАЎ ІЛЬНАЗАГАТОВАК. Найменшы процант невыкананьня пляну б'е па вытворчых заданьнях тэкстыльнай прамысловасьці і тым наносіць удар па справе стварэньня прамтаварных фондаў, выкананьня экспартных заданьняў.

Абавязак кожнай арганізацыі — давесьці гэту адозву да кожнага калгасу і бядняцка-серадняцкага двара, пабальшавіцку мабілізаваць масы на выкананьне пляну, на зруйнаваньне купацкага сабатажу.

Аднак, адозва дагэтуль зусім недастаткова папулярызавана сярод шырокіх мас. Апартуністычная практыка ў радзе раёнаў цягне ўніз крывую загатовак. 0,1—10,2 проц. гадовага пляну за дэкаду—больш ганебную лічбу цяжка сабе ўявіць.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы, на тое, што прайшлі ўсе тэрміны, ПЛЯН ЗАГАТОВАК ІЛЬНАВАЛАКНА ВЫКАНАН ТОЛЬКІ НА 41 ПРОЦАНТ Сапраўды агіднае становішча ў МАЗЫРСКІМ, ПАРЫЦКІМ, НАРАЎЛЯНСКІМ РАЁНАХ, якія ледзь загатовілі ад 10-15 проц. гадовага пляну.

У радзе месц не спагнаны цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных гаспадарак. Лічба—52 проц. выкананьня цьвёрдых заданьняў на 10 мая сьведчыць аб агідным патураньні клясаваму ворагу ў некаторых раёнах, аб скрыўленьні клясавай лініі, аб тым, што ў нізавых асобных зьвяньнях савецкага апарату і загатоўчых сыстэм кулацкія «пячальнікі» працягваюць сваю работу.

Рэкорд праваапартуністычных адносін да кулака пабілі КАМАРЫНСКІ і КАПЫЛЬСКІ раёны, дзе не спагнана з кулака ні аднаго кгр. ільну. У ЗАВЯЧЭЛЬСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ, ВУШАЦКАГА РАЁНУ, суд апраўдаў кулака, які злосна сабатаваў загатоўкі.

Карэспандэнцыі з Нараўлянскага і Парыцкага раёнаў сьведчаць таксама аб наяўнасьці «кандлярскага духу» ў рабоце загатоўчых сыстэм.

—« Дайце больш прамтавараў—будзе і лён». Гэтыя гутаркі зусім шкодныя і гавораць аб тым, што некаторыя загатоўцы ідуць на поводзе ў клясава-варожых элемэнтаў.

Раёны, якія фігуруюць на чорнай дошцы, імкнуцца апраўдаць сябе спасыланьнямі на аб'ектыўныя прычыны—«адсутнасьць ільну, веснавую сяўбу, ліквідацыю кулацтва і... бурны рост калектывізацыі».

Гэтыя апартуністычныя спасыланьні цалкам абвяргаюцца фактамі з работы раду раёнаў, якія ВЫКАНАЛІ ПЛЯН.

РАСОНСКІ раён, дзе праведзена вялікая масавая работа, поўнасьцю адгрузіў бульбу. ЛЁЗЬНЕНСКІ І ВЫСАЧАНСКІ раёны выканалі гадовыя пляны ільнагатовак.

Член Вендараскага сельсавету, Магілёўскага раёну, тав. РАДОЦКІ, які растлумачыў сялянам адозву рабочых «Дзьвіны», дабіўся вялікіх посьпехаў у загатоўках ільну і сабраў сотні кгр. ільну там, дзе раней не сабрана ніводнага.

Гэтыя факты сьведчаць аб тым, што гутаркі аб аб'ектыўных прычынах—толькі шыльда для самастрахоўкі, для укрыцьця ўпаскай бязьдзейнасьці і няўменьня працаваць.

Марудны ход загатовак асноўных сельгаспрадуктаў за апошні час—вынік недапушчальна-абазадкавых адносін у радзе месц да важнейшых заданьняў. Раз назаўсёды трэба пакласьці канец такому становішчу! Трэба моцна ўдарыць па апартуністах, якія ня могуць і не жадаюць па-баявому праводзіць гаспадарча-палітычныя кампаніі.

Наркамснаб павінен значна больш і лепш перабудаваць сваю работу, ліквідаваць бюракратызм, нярухомасьць апарату, наладзіць выразнае апэратыўнае кіраўніцтва пэрыферыяй.

Перабудова работы спажывецкай кооперацыі, арганізацыя загатоўчых галінавых аб'яднаньняў пры Белкаапсаюзе павінна палепшыць работу па загатоўках.

Асноўная ўмова посьпеху загатовак—цесная ўвязка іх з калгасным прыпівам, кантрактацыяй, выкананьнем пляну веснавой сяўбы.

Тэмпы трэцяга рашаючага патрабуюць ПОЎНАГА выкананьня пляну загатовак усіх відаў сельгаспрадуктаў.

Гэта важнейшая задача ўсіх партарганізацый.

Супроць падбродзкай правакацыі ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ

ПРАТЭСТ МІЛЬЕНАЎ

Падбродзьдзе--толькі прадлог для новай крывавай „пацыфікацыі“ Зах. Беларус

Заслухаўшы інфармацыю аб апошніх падзеях у Зах. Беларусі, рабочыя бабруйскай швэйнай фабрыкі імя Дзяржынскага заяўляюць: «Мы з надзвычайнай пільнасьцю і важнасьцю сочым за падзеямі ў Зах. Беларусі і ў Польшчы. Факты гавораць аб тым, што польскі фашызм рыхтуе новую правакацыю ў адносінах да рэвалюцыйнага руху ў акупаванай Зах. Беларусі, што рыхтуецца новае «уціхаміраньне», новыя карныя экспэдыцыі, новыя забойствы і катаваньні рэвалюцыйных рабочых і сялян. Мы, рабочыя швэйнай фабрыкі, дасканала разумеем сэнс правакацыйнай шумихі, якая ўзьнята за апошнія дні фашысцкімі пісакамі навокал дакананага дэфэнзывай замаху на Падбродзкую станцыю.

Мы ня можам спакойна глядзець на нячуваны разгул белага тэрору ў Зах. Беларусі і Польшчы. Мы добра ведаем, што гэтыя масавыя забойствы і катаваньні з мэтай фізычнага зьнішчэньня нашых братоў, увесь гэты тэрор зьяўляюцца адной з складаных частак падрыхтоўкі вайны супроць краіны Саветаў, узброенага нападу на Савецкую Беларусь і Савецкую Украіну.

У адказ на гэта мы з яшчэ большым энтузіязмам будзем змагацца за выкананьне пляну трэцяга рашаючага году пяцігодкі. На правакацыю фашыстаў мы адкажам масавым уступленьнем у рады МОПР'у і паляпшэньнем работы мопраўскіх ячэек, узмацненьнем нашай работы па падрыхтоўцы абароны савецкай краіны ад нападу імпэрыялістаў.

***

Агульны сход калгасьнікаў калгасаў «Усход», «Ленінскі заклін», і аднаасобнікаў вёскі Ліпск і Улесьсе ў адказ на нячуваны тэрор фашысцкіх акупантаў і беларускіх нац-фашыстаў у Зах. Беларусі, у адказ на новую правакацыю у Падбродзьдзі абяцае правесьці датэрміновa другі бальшавіцкі сеў.

***

Агульны сход студэнтаў і выкладчыкаў Гомельскага агра-пэдінстытуту рашуча пратэстуе супроць правакацыйнага бомбанага замаху ў Падбродзьдзі, які быў зроблен фашысцкай ахранкай з мэтай правядзеньня разгрому рэвалюцыйнага руху на Зах. Беларусі.

У адказ на новую правакацыю і фашысцкі тэрор белапанскіх акупантаў і беларускіх нацыянал-фашыстаў агульны сход пастанаўляе аддаць усе сілы на выкананьне навучальнага прамфінпляну, на ўзмацненьне баяніізацыі, на энэргічнае правядзеньне мопраўскай і асаавіяхімаўскай працы.

***

Міжсаюзны сход мястэчка Сьмілавічы пратэстуе супроць новай правакацыі крывавых фашысцкіх катаў, накіраванай да фізычнага зьнішчэньня кампартыі Зах. Беларусі і адначасова пастанаўляе яшчэ больш узмацніць рады МОПР'у і адлічвае 1 проц. месячнага заробку на карысьць палітзьняволеных.

Фашысцкія каты за «работай».

Зьверскі расстрэл паліцэйшчынай дэманстрантаў гарнякоў у Яворна

ВАРШАВА, 20. На капальні Яворна (Кракаўскі вугальны басэйн) адбыўся зьверскі расстрэл паліцыяй бастуючых гарнякоў. Пасьля таго, як перагаворы рабочых з прадпрыемцамі скончыліся без рэзультатаў, на капальні выбухнула забастоўка.

Рабочыя, абураныя здрадніцкімі паводзінамі сваіх пэпэсэсаўскіх кіраўнікоў, якія заклікалі іх да спыненьня забастоўкі, да ўрэгуляваньня канфлікту, арганізавалі пад кіраўніцтвам камуністаў масавы мітынг і дэманстрацыю. Дэманстранты зламалі на капальні брамы, разбурылі кантору і пачалі бамбардаваць каменьнямі паліцэйскіх, якія знаходзіліся ў капальні. Паліцыя адкрыла па стральбу: Чатары рабочых забіта і 7 цяжка паранена. Пад націскам паліцыі натоўп рызыцоўся, ўносячы за сабой параненых. Аднак, частка дэманстрантаў арганізавана накіравалася на шашы, якая вядзе ад капальні да гораду Бычыны, дзе пачала рабіць з каменьняў барыкады.

Сярод рабочых пануе нячуванае абурэньне. Забастоўка працягваецца. Увесь друк вымушан прызнаць, што кіраўніцтва рабочым рухам адыходзіць з рук ППС, пераходзячы да камуністаў. Газэты патрабуюць застасаваньня выключна га закону супроць камуністаў. (ТАСС).

Барацьба рабочых віленскіх гут

ВІЛЬНЯ. Наступленьне капіталістаў, якое асабліва жорстка праводзіцца ў Зах. Беларусі, выклікае з боку рабочае клясы рашучае супраціўленьне. У адказ на зьмяншэньне зарплаты і павялічэньне рабочага дня рабочы Кальварыйскай гуты, а таксама гут «Вітрум» абвясьцілі забастоўку.

Як паведамляе віленскі фашысцкі друк, у інспэктарыяце працы адбылася канфэрэнцыя прадстаўнікоў рабочых прадпрыемцаў. Канфэрэнцыя не дала ніякіх вынікаў, бо ні рабочыя, ні прадпрыемцы на ўступкі нехацелі пайсьці.

Адзіны выхад з крызісу, галечы і голаду--ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ

Пратакол аб „эканамічным ненападаньні“ прымушае імпэрыялістаў раскрыць свае пляны
ПРАМОВА тав. ЛІТВІНАВА—У ЦЭНТРЫ УВАГІ КАНФЭРЭНЦЫІ

БАРАЦЬБА ДЗЬВЁХ СЫСТЭМ

Калі Брыян высунуў сваю «ідэю» стварэньня пан-эўрапэйскага аб'яднаньня, ён меў на ўвазе вырашыць тры асноўныя задачы французкага імпэрыялізму: стварыць адзіны фронт эўрапэйскага капіталізму супроць СССР, проціпаставіць наступаючаму амэрыканскаму імпэрыялізму адзіны эўрапэйскі блёк з уключэньнем Англіі і замацаваць тую сыстэму палітычнай гегемоніі французкага імпэрыялізму на кантынэнце Эўропы, якая пакоіцца на Вэрсальскім дагаворы і на задушэньні Нямеччыны.

Сусьветны эканамічны крызіс, які паглыбіўся, разбурыў усе хітраразумныя разьлікі Брыяна, ён абвострыў да надзвычайнасьці ўсе эканамічныя і палітычныя супярэчнасьці, у тым ліку агаліў супярэчнасьці ўнутры астарэлай капіталістычнай Эўропы. Крызіс па-новаму паставіў рад важнейшых эканамічных праблем, ён узмацніў пануючую ў капіталістычным сьвеце анархію і прывёў да распаду або паслабленьня старых і стварэньня новых палітычных груповак імпэрыялістычных дяржаў і іх васалаў. Разам з тым, эканамічны крызіс спрыяў рэзкаму абвастрэньню ўсіх супярэчнасьцяй капіталізму, далейшаму магутнаму ўздыму рэвалюцыйнага руху, і нарастаньню ў радзе краін прадпасылак да рэвалюцыйнага крызісу.

У такіх умовах ініцыятары пан-Эўропы аказаліся прымушанымі паставіць у парадак дня пан-эўрапэйскай камісіі пытаньне аб эканамічным крызісе і спосабе барацьбы з ім. Яны гэта зрабілі, папершае, для таго, каб стварыць у шырокіх масах ілюзіі, нібы капіталістычныя ўрады хочуць на справе заняцца прыняцьцем сапраўдных мер у барацьбе супроць крызісу і нібы яны здольны знайсьці іх; па-другое, для таго, каб «адкрыць якійсьці кампраміс паміж імпэрыялістычнымі дяржавамі, што знаходзяцца ва ўзаемнай барацьбе, і ў першую галаву разьлічвалі заключыць такі за кошт СССР. Пры гэтым, усе яны спадзяваліся выкарыстаць жэнэўскую арану для манэўраў сваіх уласных імпэрыялістычных інтарэсаў, для ўзмацненьня пазыцыі тэй ці іншай імпэрыялістычнай групоўкі і, нарэшце, для скапочаньня ў новых умовах антысавецкага блёку, для ўзмацненьня барацьбы з пяцігодкай і для падрыхтоўкі вайны і інтэрвэнцыі. Тая вялікая колькасьць праектаў, накшталт праекту аўстра-нямецкай мытнай уніі, контр-праекту Брыяна - Франсуа Понсэ, накшталт аўстра-вэнгерска-італьянскай эканамічнай згоды і г. д., высунутыя ў апошні час, сьведчаць аб узрастаньні эканамічнага і палітычнага хаосу і абвострэньні барацьбы паміж імпэрыялістычнымі групоўкамі ў Эўропе.

Зусім натуральна, што для абрабленьня ўсіх трох палітычных камбінацый і для згушчэньня туману вакол жэнэўскай палітычнай кухні, арганізатарам пан-Эўропы вельмі хацелася-б застацца без сьведак. Таму прысутнасьць СССР у Жэнэве імкнула надзвычай непакадана, таму яны з такой лютасьцю змагаліся супроць запрашэньня яго прадстаўнікоў. Ня гледзячы на ўсе іх намаганьні, ім усё-ж не ўдалося выключыць СССР з пан-эўрапэйскай камісіі. Прычынамі гэтага зьяўляюцца тыя вострыя супярэчнасьці, якія разьдзіраюць капіталістычны сьвет.

Італьянска-французкія, нямецка-французкія супярэчнасьці, боязнь Англіі аб'яднаньня эўрапэйскага кантынэнту пад гегемоніяй французкага імпэрыялізму і г. д., усё гэта прывяло да таго, што некаторыя капіталістычныя краіны аказаліся зацікаўленымі ў прыцігненьні такога магутнага палітычнага і эканамічнага фактару, як СССР. Супярэчнасьці паміж імпэрыялістамі аказаліся настолькі істотнымі, што ня гледзячы на імкненьне да стварэньня адзінага капіталістычнага блёку супроць СССР, апошні пасьля доўгай закуліснай цяганіны быў запрошан на канфэрэнцыю. У рэзультаце нават Брыян аказаўся вымушаным «вітаць» скрозь зубы савецкую дэлегацыю ў Жэнэве.

У працягу некалькіх дзён дзяржаўныя мужы і хітраумныя мудрацы капіталістычнай Эўропы бясплённа спаборнічаюць у абароне сваіх праектаў «выратаваньня Эўропы» і «выхаду з крызісу», прычым кожны з іх імкнецца зганьбіць праект праціўніка. Само сабою зразумела, што ўсе гэтыя праекты, па сутнасьці, і ня мелі мэтай сапраўднай барацьбы з сусьветным крызісам, бо іх творцы клапаціліся толькі аб адным—аб мерах, якія могуць захаваць і памножыць звышпрыбыткі буржуазіі іх бацькаўшчыны. У адным толькі гэтыя праекты сходзяцца: усе яны пабудаваны на зьдзелцы паміж кіруючымі клясамі некаторых капіталістычных краін за кошт новага наступленьня на жыцьцёвы ўзровень працоўных мас, за кошт новага рабунку пралетарыяту і працоўнага сялянства, за кошт пераладжаньня крызісу на слабыя і калёніяльныя краіны і за кошт краіны, дзе будуецца сацыялізм.

Тыповым праектам гэтага роду, асабліва завостраным супроць СССР, зьяўляецца так званы контр-праект Брыяна-Франсуа Понсе, які (паміма свайго антысавецкага і антыпямецкага напрамку) заснован таксама на зьдзельцы паміж французкім фінансавым капіталам і буржуазна - памешчыцкай верхавінай аграрных дяржаў паўднёва-ўсходняй і ўсходняй Эўропы за кошт працоўных гэтых-жа краін.

Асноўны сэнс італьянскага праекту, прапанаванага Грандзі, гэта шляхам узаемных уступак—машней зьвязаць з буржуазна-памешчыцкіх верхавін Італіі, Аўстрыі і Вэнгрыі палітычны блёк гэтых краін, завостраны супроць французкага імпэрыялізму і адначасова не дапускаючы празьмернага ўмацаваньня Нямеччыны. Зразумела, што і гэта зьдзелка міркуе супольнае рабаваньне вэнгерскіх, аўстрыйскіх і італьянскіх рабочых і сялян.

Такім чынам, капіталісты даволі адкрыта ўказваюць «выхад з крызісу» па шляху УЗМАЦНЕНЬНЯ КАПІТАЛІСТЫЧНАГА НЯВОЛЬНІЦТВА ДЛЯ ШЫРОКІХ МАС РАБОЧАЕ КЛЯСЫ І ПРАЦОЎНЫХ. Зусім зразумела, што ўсе гэтыя хітраумныя рэцэпты жэнэўскіх мудрацоў таксама здольны вылечыць Эўропу ад эканамічнага крызісу, як ледзянцы ад кашлю хворага крупозным запаленьнем лёгкіх.

У абстаноўцы хаосу і блытаніны ў Жэнэве прамова старшыні савецкай дэлегацыі тав. Літвінава рэзка выдзялілася сваімі зусім іншымі прынцыповымі ўстаноўкамі. Яна дае належную ацэнку жэнэўскай цяганіне, яна з бязьлітаснай яснасьцю ўскрывае сапраўдныя прычыны эканамічнага крызісу, яна выкрывае сацыяльны зьмест усіх прапанаваных у Жэнэве плянаў «выратаваньня Эўропы» і зноў адкрыта ставіць перад прадстаўнікамі кіруючых кляс, што сабралася ў Жэнэве і далёка па-за межамі жэнэўскай гаварыльні, перад усёй рабочай клясай карэнная пытаньне сучаснасьці—пытаньне аб узаемаадносінах паміж дзьвюма сацыяльнымі сыстэмамі—капіталістычным сьветам і СССР.

Прадстаўнікі капіталістычных дяржаў у Жэнэве разьлічвалі сваімі знахаркімі рэцэптамі перамаганьня эканамічнага крызісу стварыць сярод шырокіх мас ілюзію, быццам існуюць якіясьці спосабы цудоўнага вылячэньня капіталізму. Прамова тав. Літвінава выкрывае гэтыя манэўры жэнэўскіх дыплёматаў. Процістаўленьнем дзьвёх сыстэм, крызісу капіталізму і гіганцкіх посьпехаў сацыялізму яна асьвятляе асаблівасьць цяперашняга эканамічнага крызісу, як крызісу, што адбываецца ў рамках усеагульнага крызісу капіталізму. Адразу-ж усе іншыя пытаньні машынай дыплёматычнай «возни» аказаліся адсунутымі ў бок самім фактам гэтага процістаўленьня праблемы ўзаемаадносін паміж дзьвюма сыстэмамі.

Прамова тав. Літвінава выкрыла сапраўдныя мэты і пляны імпэрыялістаў, выкрываючы непрымірымую процілеглась дзьвёх сыстэм і падрыхтоўку імпэрыялістычнай вайны супроць СССР. Разам з тым, тав. Літвінаў выказаў перакананьне, што барацьба паміж гэтымі дзьвюма сыстэмамі, паколькі гэта залежыць ад СССР, можа весьціся на аснове свабоднага спаборніцтва, на аснове мірнага існаваньня на даным адрэзку часу.

Уражаньне ад выступленьня савецкай дэлегацыі было такое вялікае, што прадстаўнікі буйнейшых імпэрыялістычных краін былі вымушаны выступіць з «мірнымі» запэўненьнямі па адрасе Савецкага Саюзу. Само сабою зразумела, што пралетарыят ведае сапраўдную цану гэтым запэўненьням.

Прапанаваны тав. Літвінавым пратакол аб «эканамічным ненападаньні» вымушае імпэрыялістаў РАСКРЫЦЬ СВАЁ САПРАЎДНЫЯ МЭТЫ. Прапануючы заключыць абавязацельства аб адмаўленьні аб эканамічнай агрэсіі, ад ваенных мэтадаў вырашэньня эканамічных супярэчнасьцяй, і ў прыватнасьці супярэчнасьці дзьвёх сацыяльных сыстэм—САВЕЦКІ САЮЗ ЯСНА І ВЫРАЗНА ЗАЯЎЛЯЕ АБ СВАІХ МІРНЫХ МЭТАХ. Савецкі пратакол выкрывае арганізатараў эканамічнага байкоту і падпальшчыкаў вайны супроць Савецкага Саюзу.

Ставячы на абгаварэньне пытаньне аб узаемаадносінах паміж дзьвюма сыстэмамі, прамова тав. Літвінава ўскрывае перад сотнямі мільёнаў працоўных асноўную праблему сучаснасьці і, разам з тым, указвае ім той шлях, на які магчымы адзіны выхад з хаосу крызісу і галечы — ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ («ПРАВДА»).

Вялізарнае ўражаньне ад прамовы тав. Літвінава

ЖЭНЭВА, 20 Прамова тав. Літвінава зрабіла на ўсе жэнэўскіз колы такое вялізарнае ўражаньне сваёй сур'ёзнасьцю і зьместам, што нават мясцовы рэакцыйны лісток «Журналь Дэ-Жэнэў», зьвязаны з найбольш антысавецкімі коламі Лігі нацый і які звычайна карыстаўся ўсякім выпадкам для рэзкіх нападаў на Савецкі Саюз, вымушан адзначыць, што прамова слухалася з вялікім інтарэсам. Газэта малянхалічна канстатуе, што крытыка капіталістычнай сыстэмы была дана Літвінава лёгкай задачай. На германскія колы вельмі добрае ўражэньне зрабіла тое месца прамовы, якое намякае на аўстра-германскае пытаньне.

ЖЭНЭВА, 20 Савет Лігі нацый пастанавіў перадаць пытаньне аб аўстра-германскім мытным саюзе на разгляд міжнароднага гаагскага трыбуналу.

Салаўіныя песьні Залескага пад лязгам зброі польскай ваеншчыны

ЖЭНЭВА, 20. Прадстаўнік Польшчы Залескі ў канцы сваёй прамовы заявіў: «я хачу падкрэсьліць прымірэнчы характар прамовы прадстаўніка СССР. Добра вядомы той факт, што зварот СССР на міжнародны рынак, як пакупніка і прадаўца, выклікала затрудненьні ў сусьветным гандлі, непакой ў эканамічных колах, а гэта дало савецкай прэсе повад для пэўных непакояў.

У гэтых умовах заявы Літвінава здольны разьвеяць цьматлікія непаразумеьні з повазу тэй ролі, якую грае зараз СССР у сусьветнай эканоміцы і якую ён мяркуе грань у будачым. Я хачу канстатаваць, што прынцыпы, сфармуляваныя ў прамове Літвінава, відаць дазваляюць чакаць эканамічнага супрацоўніцтва СССР з іншымі краінамі. Я маю надзею што Літвінаў вернецца ў сваю краіну з упэўненасьцю, што нідзе ня рыхтуюца ніякія пляны аб кааліцыях супроць СССР і што ўсе падобныя чуткі бязглуздыя, пазбаўлены якіх-бы та ні было падстаў. Я ўпэўнен, што ніякі эўрапэйскі ўрад ня думае аб стварэньні кааліцыі супроць СССР. Калі Літвінаў упэўніцца ў гэтым, яго знаходжаньне сярод нас будзе надзвычай карысным для разьвіцьця мірнага міжнароднага супрацоўніцтва».

Камісія прымае рэзалюцыю, прапанаваную Гендэрсонам, і вылучае падкамісію ў складзе Нямеччыны, СССР, Аўстрыі Польшчы, Румыніі, Швэцыі, Швайцарыі, Чэхаславакіі, Турцыі і Югаславіі пад старшынствам швайцарца Мота.

У часе доўгай дыскусіі сёньняшняга пасяджэньня ў цэнтры ўвагі былі ўсе заявы па адрасе СССР, якія аблюстроўвалі вялікі посьпех выступленьняў тав. Літвінава. Разам з тым стварылася ўражаньне, нібы хочуць паказаць справу так, што СССР зрабіў нейкі паварот у сваёй палітыцы ў бок «супрацоўніцтва», які вітаецца ў той час, як прамова Літвінава, як вядома мела толькі палажэньні, якія шмат разоў выказваліся і ў мінулым.

Гендэрсон змазвае падрыхтоўку імпэрыялістаў да вайны

ЖЭНЭВА. 20 мая на пасяджэньні працягвалася агульная дыскусія па пытаньні аб крызісе. З вялікай прамовай выступае міністар замежных спраў Англіі Гендэрсон, які заўляе, што сучасны крызіс зьяўляецца найбольш вострым у параўнаньні з тымі, што касі-нібуць адбываліся. Гендэрсон малое карціну галечы, беспрацоўя, голаду, накапленьня мёртвых капіталаў у падвалах банкаў і патрабуе «рашучага супрацоўніцтва» паміж народамі. Гендэрсон гаворыць, што далучаецца да заявы тав. Літвінава, што прычыны крызісу шматлікія і разнастайныя. У прыватнасьці, ён гаворыць, что да-стваў, пучаецца да заявы аб значэньні выніка ў вайны і росту ўзбраеньняў.

Далей Гендэрсон гаворыць, што ён ня згодзен з Літвінавым, які выцягвае ваенныя пляны супроць СССР, як характэрны фактар сучаснага цяжкага становішча. «Я прашу, — гаворыць Гендэрсон , — яго адмовіцца ад усякай думкі нібы члены Лігі нацый рыхтуюць вайну супроць яго народу: Я ўпэўнены яго, што мы спадзяемся на рост мірных адносін і гандлю паміж яго краінай і нашымі. Мы будзем вітаць усякую дапамогу, якую ён можа аказаць нам для захаваньня міжнародных абавязацельстваў».

Чарговая антысавецкая правакацыя фашызму ў Львове

Наглыя пагрозы фашысцкага друку па адрасе савецкага паўпрэдзтва

Пратэст савецкага пасольства ў Варшаве

ВАРШАВА, 20. За апошнія дні ў савецкае паўпрэдзтва ў Львове сталі зьяўляцца па 100-150 беспрацоўных з просьбай накіраваць іх на работу ў СССР. Наплыў беспрацоўных, у сувязі з зьяўшымися ў польскім друку паведамленьнямі аб рэапізацыі ў СССР пяцігодкі і недахопе там рабочай сілы, — узрастаў з кожным днём. 18 мая ў Львоўскім паўпрэдзтве перабывала 500 беспрацоўных і ніякія растлумачэньні, што паўпрэдзтва вярбоўкі рабочых не праводзіць, на іх ня ўзьдзейнічалі.

Учора ў поўдзень у садку пя будынку паўпрэдзтва сабралася каля 300 беспрацоўных. Конныя і пахотныя паліцэйскія сталі сілай разганяць беспрацоўных, робячы сярод іх арышты. Ня гледзячы на тое, што пасьля гэтага ўвесь квартал, у якім знаходзіцца паўпрэдзтва, быў абведзен паліцэйскімі, якія не прапускалі ў паўпрэдзтва бедна адзетых людзей, у паўпрэдзтва сабралася праз платы і суседнія дамы да 50 беспрацоўных. Намесьнік савецкага паўпрэдзтва энэргічна пратэставаў перад мясцовымі ўладамі супроць дзеяньняў паліцэйскіх, якія не прапускалі ў паўпрэдзтва наведвальнікаў, але гэтыя пратэсты засталіся бяз вынікаў.

Сёньнішнія газэты перапоўнены агіднейшымі правакацыйнымі паведамленьнямі з Львова і НАГЛЫМІ НАПАДКАМІ НА САВЕЦКАЕ ПАЎПРЭДЗТВА. Пад крыклівымі загалоўкамі: «Нячуваная выхадка савецкага паўпрэда ў Львове», «Савецкі паўпрэд узбуджае беспрацоўных, раздае даляры і зьнімае на кінаістужку сутычкі беспрацоўных з паліцыяй», «Савецкае паўпрэдзтва агітуе сярод беспрацоўных», «Загадкавыя махінацыі бальшавікоў у Львове», «Савецкае паўпрэдзтва інсцэнірує дэманстрацыі, каб зьясьніць антыпольскі агітацыйны фільм»,—газэты зьмяшчаюць зусім фантастычныя паведамленьні аб падзеях у Львове. Гэтыя паведамленьні падаюць, што быццам-бы 18 мая беспрацоўныя, якія сабраліся, як звычайна перад будынкам біржы працы, падбухторваліся невядомымі асобамі «З ЗАМЕЖНЫМІ РЫСАМІ ТВАРУ», якія распаўсюджвалі паведамленьні аб тым, што быццам-бы савецкае паўпрэдзтва вярбуе рабочую сілу для СССР і выдае тым, якія адпраўляюцца, грашовыя авансы. Натоўп у колькасьці 500 чал. накіраваўся да паўпрэдзтва і патрабаваў прадстаўленьня работы ў СССР. «Кур'ер Ілюстраваны Цодзенны» піша, што сярод беспрацоўных агітаваалі камуністы, а «Кур'ер Чэрвоны» цынічна заяўляе, што ўсё гэта справа рук савецкага паўпрэдзтва.

Далей ВЫМЫС

По-ўдарному правесьці месячнік пролетарскага друку

За большую апэрацыйнасьць

фабрычна-заводзкіх шматтыражак

Павысіць ролю фабрычна-заводзкіх газэт у барацьбе за прамфінплян — важнейшая задача месячніку друку. Не фіксаваць факты, а арганізоўваць, мабілізаваць масу на важнейшых пытаньнях дня

Стаць сапраўднымі байцамі за прамфінплян

Пролетары всех стран, соединяйтесь!
КАМУНАРАВЕЦ 4
Нікай жыве 1 Мая баявы агляд рэвалюцыйных сіл жыцьця

За выкананьне прамфінпляну адказвае нараўні з «трыкутнікам» прадпрыемства і рэдкалегія заводзка-фабрычнай газэты. Таму меркаваць аб рабоце рэдкалегіі і газэты таго ці іншага прадпрыемства можна і трэба выходзячы з лічбаў выкананьня прамфінпляну.

Рэдкалегія і газэта **менскага заводу «Камунар»** паказваюць прыклад слабай барацьбы за прамфінплян.

Калі праграма за першы квартал была выканана на 73,7%, то за красавік зна выканана ўсяго на 53%. Гэта колькасны паказальнік. Ня лепш і з **якасьнымі** паказальнікамі. Сабекошт за першы квартал зьнижан замест 13% толькі на 2,9%. **Брак расьце.** У першым кварталі ліцейны цэх даў 9-10% браку, у красавіку — амаль 17%. Кавальскі цэх даў у першым кварталі каля 16% браку, у красавіку — 26%. **Расьце і колькасьць прагулаў.** За першы квартал было ў сярэднім у месяц 48 прагулаў, у красавіку — 67.

Сама газэта заводу «Камунаравец», падводзячы вынікі работы за красавік, указвае, што «прычынай невыкананьня прамфінпляну зьяўляецца слабая работа як цэхавай адміністрацыі, так і партыйнай, камсамольскай ячэек і цэхкамітэтаў у цэлым», «замешанасьць, няўменьне мабілізаваць і правільна — плянава разьмеркаваць рэсурсы, аслабленьне ўсёй грамадзкай агітмасавай работы, а рэзультат усяго гэтага—аслабленьне ўдарніцтва і сацспаборніцтва».

Але, канстатуючы ўсе гэтыя факты, друкуючы лічбовыя зводкі, якія проста **крычаць** аб нядобрым стане заводу, рэдкалегія павінна была разгарнуць актыўную і масавую барацьбу з прычынамі прарываў, з канкрэтнымі носьбітамі ад, **арганізаваць** масы на перамогу ўсякіх «чуднасьцяй, дабіцца ўздыму ўдарніцтва і сацспаборніцтва, **перанесьці ў цэхі свайго заводу лепшы вопыт перадавых прадпрыемстваў Савецкага Саюзу.**

Нельга сказаць, каб **«Камунаравец»** не **закранаў** усіх гэтых пытаньняў. Але толькі «закранаў».

Рэдкалегія **«Камунараўца»** абмяжоўваецца ў значнай ступені выкрываючай дзейнасьцю, канстатаваньнем фактаў. У паасобных выпадках рэдкалегія, выкрываючы, дабіваецца качкрэтных вынікаў (зьнячыця з работы, спагнаньня). Некаторыя адсталыя рабочыя, трапляючы на «пяро рабкора», напраўляюцца, пачынаюць працаваць па-ўдарнаму, спыняюць прагулы, больш уважліва адносяцца да якасьці прадукцыі. Члены рэдкалегіі, рэдактар газэты ідуць у цэхі, прымаюць удзел у выцворчых нарадах, указваюць на недахопы ў рабоце, дабіваюцца зьнішчэньня іх. Але гэтыя паасобныя посьпехі газэты не зьяўляюцца рашаючымі. Яны вельмі мізэрныя, невыстарчальныя, каб аказаць сурёзны, рашаючы ўплыў на выкананьне прамфінпляну.

Рэдкалегія вядзе і некаторую масавую работу. З № 3 (20 красавіка) у шматтыражны зьявіліся заметкі **ўдарных рабкораўскіх брыгад.** У гэтым нумары зьмешчана 6 такіх заметак, у № 7 —2 заметкі, у № 8—3 заметкі ўдарных брыгад. У кожнай брыгадзе—па 3-4 чалавекі. Але работа рэдкалегіі з ударнымі рабкораўскімі брыгадамі кае буйны прабел. Адносіны да рабкораўскіх брыгад чыста **спажывецкія.** Патрэбен матар'ял для газэты — пасылаецца брыгада. Інструктаж брыгад — паварко ўны, брыгады невыстарчальна падрыхтоўваюцца да выкананьня свайго заданьня. Ні па адным канкрэтным аб'екце работы рабкораўскіх брыгад ня было такой інструкцыйнай нарады, якая-б сапраўды дапамагла рабкорам уявіць усё значэньне данага пытаньня. **Арганізатарская роля** рабкораўскіх брыгад пры дачы таго ці іншага заданьня ня была завострана. Рабкораўская брыгада на сутнасьці павінна зьявіцца і брыгадай дапамогі. Выявіўшы тыя ці іншыя слабыя бакі работы цэху або брыгады, яна павінна вызначыць і рад практычных мерапрыемстваў для зьнішчэньня гэтых недахопаў, павінна дапамагчы гэтым мерапрыемствы ажыцьцявіць. У гэтай справе зноў такі вялікае значэньне мае перадача лепшага вопыту работы перадавых цэхаў, лепшых ударных брыгад.

У паасобных выпадках рабкоры-ўдарнікі «Камунараўца» зьяўляліся ініцыятарамі вялікіх мерапрыемстваў. Напрыклад, рабкоры-ўдарнікі сьлясарна-зборачнага цэху Дрыкер і Турэцкі арганізавалі да 1 мая вытворчую камуну, рабкор-ударнік Чарнушэвіч арганізуе пасеў «гэктара друку» ў прыгараднай гаспадарцы, унёс пералом у работу ячэйкі МОПР'у. Але гэта паасобныя выпадкі.

У слабай рабоце газэты вінавата не адна рэдкалегія. Вінаваты і заводзкія арганізацыі, якія не дапамагаюць рэдкалегіі (між іншым, за апошнія 3 месяцы зьмянялася тры рэдактары), вінавата і адміністрацыя, якая ўпарта не рэагуе на заметкі рабкораў. Аднак, увагі да сваёй работы рэдкалегія мала-б дабіцца, калі-б гэтага сур'ёзна пажадала. У рабоце самой рэдкалегіі нямала недахопаў. Замест 7 членаў рэдкалегіі (апрача рэдактара) працуюць 2-3 чал. Ёсьць рэдактар — і ўся работа ўзвалена на яго, у дадатак на яго-ж узвалена **ўся масавая работа парткалектыву.** Ня бачыць дапамогі рэдкалегія і ад рэдакцый менскіх газэт, хоць «паломніцтва» рэдакцыйных работнікаў за «матар'ялам» ідзе «бесьперапынным патокам»: рэдкі дзень калі на заводзе ня бывае 2-3 супрацоўнікаў цэнтральных газэт.

Што мы раім рэдкалегіі? **Перабудаваць сваю работу.** Галоўны ўпор зрабіць на перанясеньне на «Камунар» лепшага вопыту работы перадавых прадпрыемстваў Савецкага Саюзу (вопыт заводаў імя Леніна і Бальтыйскага па пераводзе брыгад на сацыялістычны гаспадарчы разрахунак — «Труд» ад 20 сакавіка 1931 г; вопыт Марыўпальскага заводу імя Ільліча па ўцягненьні ўсіх рабочых у апэрацыйнае плянаваньне шляхам складаньня штодзённых брыгадных сустрачных плянаў—«Труд» ад 19 красавіка б.г.; вопыт Ленінграда і Архангельску па арганізацыі «брыгад дапамогі» ў прафрабоце — «Труд» ад 12 і 18 мая г.г.). Арганізаваць шырокі абмен лепшым вопытам работы **паміж цэхамі, брыгадамі і паасобнымі ўдарнікамі свайго заводу,** надхапляючы кожнае добрае пачынаньне, пераводзячы яго неадкладна на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва, уцягваючы ў гэту справу ў якасьці **арганізатараў** рабкораў—ударнікаў.

З другога боку зноў такі пры акцыўнай дапамозе ўдарнікаў-рабкораў штодзённа выяўляць канкрэтныя тормазы ў рабоце цэхаў і брыгад, заводзкіх арганізацый, заводакіраўніцтва, арганізаваць шырокую **практычную** дапамогу на кожным асобным пытаньні з боку ўсяго рабкораўскага актыву і лепшых ударнікаў, выклікаючы іх ініцыятыву ў арганізацыі і ажыцьцяўленьні мерапрыемстваў, патрэбных для выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну.

У гэтай вялікай і складанай рабоце бюро парткалектыву і цэх'ячэйак павінны ператварыцца з пасыўных назіральнікаў у актыўных арганізатараў газэтнай і рабкораўскай работы. Бюро парткалектыву не павінна ні на мінуту забываць, што шматтыражка зьяўляецца органам бюро і што адказнасьць за работу газэты кладзецца палкам і поўнасьцю на парткалектыў.

П.

Даць разгорнуты паказ

РАБОТЫ УДАРНІКАЎ

НАСЬЦЕНГАЗЭТА РЫМАРНАЙ ФАБРЫКІ (Мэгілёў) набыла вялікія посьпехі ў змаганьні за выкананьне прамфінпляну. Гэтыя посьпехі, асабліва значныя ў другім кварталe бягучага году. У першым кварталe рымарная фабрыка выканала прамфінплян толькі на 96,3 проц. Газэта забіла трывогу. На сваіх старонках яна выкрыла тыя перашкоды, якія стаялі на шляху поўнага выкананьня вытворчай праграмы. Хамутны цэх адставаў больш за ўсе астатнія. За дзьве дэкады другога кварталу ён выканаў прамфінплян толькі на 63,2 проц. Выкрываючы перашкоды, газэта паказвае рабочым масам тыя шляхі, г[illegible] якія можна ліквідаваць прарывы.

Пытаньні якасьці прадукцыі ў рабоце газэты займалі цэнтральнае месца. Праз рабкораўскія допісы газэтай выкрыты канкрэтныя вінаватыя дрэнкай якасьці прадукцыі.

У сваёй рабоце газэта мела і рад недахопаў, галоўны з іх той, што газэта невыстарчальна асьвятляла, не давала шырокага разгорнутага паказу лепшых ударнікаў. Па-другое, газэта яшчэ слаба змагаецца за аўладаньне тэхнікай.

Гэтыя недахопы зьявіліся ў выніку **СЛАБАГА ПАРТЫЙНАГА КІРАЎНІЦТВА РАБОТАЙ ГАЗЭТЫ З БОКУ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ.** Партарганізацыя да гэтага часу яшчэ нават не прапрацавала пастановы ЦК УсеКП(б) аб перабудове рабселькораўскага руху. На працягу месячніка друку партарганізацыя фабрыкі павінна яшчэ больш павысіць ролю насьценгазэты ў змаганьні за бальшавіцкія тэмпы работы фабрыкі.

М—кі.

Растуць рады рабселькораў

і нізавога друку

Паводле паведамленьняў з месц, становішча рабселькораўскага руху на БССР характарызуецца наступнымі лічбамі:

Па Чырвона-Слабодзкім раёне: рабселькораў — 85, а іх жанчын — 12, насьценгазэт —50.

Па Плешчаніцкім раёне: селькораў— 200, насьценных газэт — 44.

Па Чэрвеньскім раёне: рабселькораў— 130, насьценгазэт — 51.

Па Вушацкім раёне: насьценгазэт— 42, школьных насьценных газэт — 27, рабселькораў «Прымежнага калгасніка» —223, рабкораў насьценгазэт — 71.

Па Шклоўскім раёне: насьценгазэт — 13, рабселькораў — 96, шматтыражак — 3.

Па Рэчыцкім раёне: насьценгазэт—62, рабселькораў — 750.

Па Лепельскім раёне: рабселькораў— 269, насьценгазэт — 12.

Па Полацкім раёне: рабкораў — 73, селькораў — 86, насьценгазэт — 95.

Па Бабруйскім раёне: селькораў — 100, рабкораў — 130.

Па Гомельскім раёне: рабселькораў— 4.200, насьценгазэт — 600, шматтыражак — 14.

Па Сененскім раёне: рабселькораў —120, насьценгазэт —25.

Па Асьвейскім раёне: насьценгазэт —30, рабселькораў — 53.

Па Мазырскім раёне рабселькораў — 856, насьценгазэт — 71.

Па Клімавіцкім раёне: насьценгазэт — 45, рабселькораў — 39.

Па Слуцкім раёне: насьценгазэт—41, рабселькораў — 170.

„ЧЫРВОНЫ АБУТНІК"

— Вытворчая праграма Менскай абуткоўкай фабрыкі па першы квартал была ў сур'ёзнай небясьпецы. У студзені і лютым фабрыка ня толькі выканала, але і перавыканала месячныя заданьні, а першая палова сакавіка дала глыбокі прарыў. Фабрыка выпусьціла абутку на 5.114 пар менш вызначанага плянам.

— Барацьба! Упартая барацьба! Ва што-б там ні стала ліквідаваць прарыў! Фабрыка запепакоілася. Недавыканаць прамфінплян — значыцца нанесьці ўдар трэцяму рашаючаму, пяцігодцы. Ні ў якім разе!

— У гэтай гэраічнай барацьбе вялізную ролю адыграў **«Чырвоны абутнік»** — фабрычная шматтыражка. Яна мабілізавала шырокія масы рабочых на ліквідацыю прарыву, на выратаваньне прамфінпляну фабрыкі. **«Трэці рашаючы прарываў ня церпіць! Падраўняць франты, падцягнуць адсталыя вучасткі, палепшыць якасьць прадукцыі, — выйсьці ў першыя рады змагароў за прамфінплян»** — так заклікала газэта ў гэтыя трывожныя дні (№ 4 ад 24 сакавіка).

— У перадавым артыкуле, у гэтым-жа нумары газэта высоўвае канкрэтныя патрабаваньні, канкрэтныя задачы: **«Мы павінны дадаць 5.114 пар недавыпушчанага абутку за час прарыву, а гэта значыць, што наша праграма — ня 3.900 пар у дзень, а ня менш 4.200 пар».**

— Ударныя брыгады, вытворчыя камуны прыклалі ўсе сілы, каб павялічыць выпрацоўку прадукцыі, давесьці яе да лічбаў, паказаных «Чырвоным абутнікам». І яны дабіліся. У апошнія дні сакавіка фабрыка выпускала ня 3.900 пар у дзень, а 4.200. Гэта было цяжка, але гэта было неабходна ў інтарэсах прамфінпляну, а яны — абавязваюць.

— **Прарыў быў ліквідаваны.** Сакавіцкае заданьне было выканана на 100,1 проц., вытворчая праграма першага кварталу — на 100,5 проц. Фабрыка перамагла.

— «Чырвоны абутнік» вядзе барацьбу за прамфінплян, за разгорнутае сацыялістычных мэтадаў працы — сацспаборніцтва і ўдарніцтва — штодзённа, сыстэматычна. У апошнія паўтара месяца фабрыка зноў адстала. У красавіку месячнае заданьне было выкананa на 96,1 проц., за першую палову мая — на 82,1 проц. Асабліва дрэнна з якасьцю прадукцыі. У першым кварталe адхіленьні ад першагатуновасьці прадукцыі складалі 27 проц., у красавіку — 32,4 проц., у першую палову мая — 34,2 проц.

— Газэта зноў б'е трывогу. **«Пізнагатуновы абутак зрывае наш прамфінплян»** (№ 20). **«Калі ты даеш дрэнную прадукцыю — ты інжэ-ўдарнік»** (№ 18). Прагульшчыкам, р'яніцам, рвачом няма літасьці. Газэта сыстэматычна выкрывае іх на сваіх старонках, ставіць іх на «чорную дошку», накіроўвае супроць іх ярасьць мас. У кожным нумары «Чырвоны абутнік» друкуе зводкі аб якасьці прадукцыі, рашуча патрабуе неадкладна палепшыць яе. **«Ніхто нам не дазволіць губляць дзесяткі тысяч рублёў на паніжанай гатуновасьці абутку»** (№ 20).

— Вакол шматтыражкі групуецца рабкораўскі актыў фабрыкі. На сёнешні дзень газэта налічвае ўжо каля 100 сваіх рабкораў. Да месячніка друку на фабрыцы арганізавалася новая **рабкораўская камуна імя «Праўды».** Яна складаецца з членаў вытворчай камуны загатоўчага цэху — пераважна з камсамольцаў. У другім цэху арганізавалася жаночая **рабкораўская камуна.** Газэта пачала практыкаваць брыгадны мэтад работы з рабкорамі. Ужо праведзена некалькі рэйдаў рабкораўскіх брыгад.

***

— Крыху гісторыі. «Чырвоны абутнік» існуе ўсяго 7 з паловай месяцаў. Першы нумар яго выйшаў 30 верасьня мінулага году. Ня гледячы на такі кароткі тэрмін існаваньня, у шматтыражцы зьявіліся ўжо чатыры рэдактары. Усё гэта, бязумоўна, не магло не адбіцца адмоўна на рабоце газэты.

— «Чырвоны абутнік», у працэсе работы дапусьціў **сур'ёзныя палітычныя памылкі.** Газэта не даволі рашуча вяла барацьбу з правымі правага і «левага» апартунізму на прадпрыемстве. Слаба асьвятлялася жыцьцё партыйнай арганізацыі фабрыкі. Газэта несваячасова падхапіла сыгналы рабкораў аб фактах вялікадзяржаўнага і яўрэйскага шавінізму, якія мелі месца на фабрыцы. Пытаньні інтэрнацыянальнага выхаваньня рабочых мас знаходзяць слабы адбітак на старонках газэты.

***

— Вынікі. Шматтыражка «Чырвоны абутнік» за апошні час дабілася **пэўнага пералому** ў сваёй рабоце. Яго трэба рашуча **замацаваць. «Чырвоны абутнік» павінен яшчэ больш наблізіцца да рабочых мас фабрыкі, яшчэ больш пагпыбіць сваю работу.** Памылкі, дапушчаныя газэтай, павінны быць па-бальшавіцку выпраўлены. Фабрычныя арганізацыі — партыйны калектыў, фабком і адміністрацыя і ўся маса рабочых фабрыкі павінны актыўна дапамагчы ў гэтым сваёй газэце.

С. Г-н.

Агляд абарончай работы па БССР

САЦСПАБОРНІЦТВАМ І УДАРНІЦТВАМ

палепшым работу Асоавіяхіму, узмацнім абароназдольнасьць краіны Саветаў

Работа асоавіяхімаўскіх арганізацый, пасьпяховая барацьба за ўзмацненьне абарончай работы немагчымы без кіраўніцтва, актыўнага ўдзелу і дапамогі з боку мясцовых партыйных і савецкіх арганізацый

Агляд абарончай работы

Дэкада абароны па БССР прашла з вялікім посьпехам. Перад арганізацыямі Асоавіяхіму ставілася задача замацаваць дасягнутыя ўдарныя тэмпы работы, ахапіць практычнай работай і вучобай новыя кадры асоавіяхімаўцаў, ажыцьцявіць на справе паварот тварам да аўладаньня тэхнікай, тварам да вытворчасьці. Асоавіяхім—апора мірнай работы і абароны краіны ня можа запіскацца ў вузкіх рамках ваяннізацыі, таварыства павінна мабілізаваць масы для шырокага ўдзелу ва ўсіх гаспадарча-палітычных кампаніях.

Для замацаваньня дасягнутых посьпехаў у справе абарончай работы і далейшага яе разгортваньня, па начыне рабочых буйнейшых прадпрыемстваў Масквы, Ленінграду і Украіны, быў абвешчан у лютым «агляд абарончай работы на прадпрыемствах». Рабочыя заводу «Красный богатырь» у сваёй адозьве да ўсіх рабочых, чырвонаармейцаў, калгаснікаў, сатракоў, беднякоў у СССР аб правядзеньні агляду адзначылі, што «кожны завод, кожны калгас мы павінны ператварыць у фарпосты абароны, у школу масавай падрыхтоўкі вайсковавазучаных рэзэрваў РСЧА».

Агляд абарончай работы абвешчан і на прадпрыемствах БССР. Але-ж кампанія праходзіць самацёкам, без канкрэтнага кіраўніцтва і дапамогі з боку партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных і асоавіяхімаўскіх арганізацый. На мясцох частка прадпрыемстваў аб агляде нічога ня ведае. Першамайская кампанія ня была скарыстана для разгортваньня агляду. Менская арганізацыя Асоавіяхіму парашыла кампанію праводзіць пасьля 1 мая. У Гомелі агляд праводзяць заводы, а гарадзкі савет Асоавіяхіму аб ходзе кампаніі нічога ня ведае і аглядам ня кіруе.

Агляд зараз працягнут да 15-га чэрвеня. Партыйныя арганізацыі павінны узяць на сябе кіраўніцтва аглядам. Раённы, мясцовы насьценны друк і шматтыражкі павінны мабілізаваць масы вакол задач агляду.

Трэба памятаць, што правядзеньне агляду ня ёсьць задача «ведамственная» — асоавіяхімаўская. У агляд абарончай работы павінны ўключыцца ўсе арганізацыі.

«Вугаль, мэталь, машыны, хэмія, транспарт—гэта аснова абароны. Толькі на падставе пашырэньня тэмпаў індустрыялізацыі мы зможам узмацніць магутнасьць і баяздольнасьць нашай Чырвонай арміі і флёту, аснашчаючы іх перадавой тэхнікай» («Правда»—10/I. 1931 г.). Вытворчыя ячэйкі Асоавіяхіму разам з усімі рабочымі павінны, шырока разгортваючы вайсковую вучобу, актыўна прымаць удзел у барацьбе за выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну, арганізоўваць новыя ўдарныя брыгады імя Асоавіяхіму і інш.

Трэба дабіцца за час агляду павышэньня палітычнай актыўнасьці асоавіяхімаўскіх мас, хуткага і шырокага абмену вопытам работы на прадпрыемствах, узмацненьня і далейшага разгортваньня вайсковай работы ва ўсіх зьвенях, вярбоўкі ў вайсковыя школы і школы грамадзянскай авіяцыі, своячасовай падрыхтоўкі да летняй вайсковай вучобы і выхаду ў лягеры, ліквідацыі «паралнасьці ў шэфстве над Чырвонай арміяй».

Б—к.

Усім прыклад

Ватная фабрыка па сваёй колькасьці рабочых у 37 асоб, з якіх 11 жанчын, ня вельмі вялікая, але праробленая работа ўсім калектывам у параўнаньні з іншымі вельмі прыкладная.

Усе рабочыя на 100 проц. уступілі ў рады Асоавіяхіму. Заплочаны членскія ўзносы за 1931 г., сабралі ў фонд абароны 151 руб. 50 к., распаўсюджана лётарэйных білетаў 5-ай Усесаюзнай авіялётарэі на 75 руб. Ёсьць бібліятэка з вайсковай літаратурай, якой карыстаюцца члены ячэйкі. Выпісваюць 5 экз. часопісі «Асоавіяхім», у ячэйцы 5 клясных стралкоў.

Усім ячэйкам трэба ўзяць прыклад, а райсавету Асоавіяхіму ўзмацніць жывое кіраўніцтва.

Брыгада № 2 — БАРШАЙ, ГУРЭВІЧ.

Раўняцца па „Пралетары"

За апошні час значна ажывілася абарончая работа на заводзе «Пралетары» з Гомелі, асабліва пасьля таго, як за ў Гомелі, асабліва пасьля таго, як за ў Гомелі, асабліва пасьля таго, як бюро парткалектыву было распушчана бюро ячэйкі Асоавіяхіму і выбраны былі ў ячэйкі Асоавіяхіму і выбраны былі ў ноны склад больш адольныя таварышы.

Пры дапамозе камсамольскай ячэйкі Асоавіяхім арганізаваў страявую адзінку. Працуе стралковы гурток у складзе 25 асоб. Палепшылася работа гурткоў супроцьпавестранай абароны, толькі слаба пастаўлена пакуль дысцыпліна. Добра працуе санітарны гурток, у які ўваходзяць адны жанчыны. Трэба выпраўляць памылковыя вывады брыгады, якая адзначыла, як недахоп, што ў атрад уваходзяць толькі жанчыны. На адварот, трэба больш актыўна ўцягваць работніц, працоўных жанчын у абарончую работу.

Бюро ячэйкі ААК слаба кіруе работай атраду СПА, дапускаючы адрыў заводакіраўніцтвам ад заняткаў камандзіра складу.

Шматтыражка заводу — «Чырвоная вагранка» актыўна асьвятляе пытаньні вайсковай падрыхтоўкі і мабілізуе масы на лепшае аўладаньне тэхнікай. Газэта выпусьціла два спэцыяльныя вайсковыя нумары. Адзін нумар быў выпушчаны ноччу 30 красавіка ў часе камсамольскага паходу.

Н.

Спадзяюцца на самацёк

Пяк немагчыма абыйсьці моўчкі няўважлівых адносін да работы Асоавіяхімаўскіх мас, хуткага і шырокага абмену вопытам работы на прадпрыемствах, узмацненьня і далейшага разгортваньня вайсковай работы ва ўсіх зьвенях, вярбоўкі ў вайсковыя школы і школы грамадзянскай авіяцыі, своячасовай падрыхтоўкі да летняй вайсковай вучобы і выхаду ў лягеры, ліквідацыі «паралнасьці ў шэфстве над Чырвонай арміяй».

Пляну работы ячэйка ня мае. Уся работа праходзіць самацёкам. Партыйная, камсамольская і прафарганізацыя ня цікавяцца работай Асоавіяхіму.

Рабочыя пастанавілі адпрацаваць на пабудову дырыжабля тры з паловай гадзіны, але грошы не спагнаны.

Вінтовак «ТОЗ» ёсьць 2 шт., але за імі не наглядаюць. З атрыманых лётарэйных білетаў 5-ай Авіялётарэі на суму 200 руб. распаўсюджана толькі на 160 руб.

Вайсковая літаратура амаль што ня выпісваецца.

Сувязь з падшэфным артпалком адсутнічае. Брыгада № 5:

Гальчанка, Худаполін.

Вайсковае выхаваньне на Аршанскім вузьле у заняпадзе

Шмат магчымасьцяй ёсьць на Аршанскім вузьле для ліквідацыі вайсковай нязпісьменнасьці сярод рабочых, служачых і іх утрымацаў, але гэтыя магчымасьці кіруючымі органамі не скарыстоўваюцца па-бальшавіцку.

У чыгуначным клюбе ёсьць куток Асоавіяхіму, значна лепшы чым на ўсёй МБВ чыгунцы, але работы ў ім ніякай не вядзецца.

Ёсьць 22 вінтоўкі, якія стаяць у пірамідзе бяз усякага руху, таму што райпрафсаюз і РТС ніяк не дагаворацца, хто павінен абсталяваць зімовы цір.

Раённы транспартны савет Асоавіяхіму ніякай работы сярод рабочых і служачых не праводзіць. Члены савету бязьдзейнічаюць. Тры члены даўно ўжо выйшлі са складу савету і да гэтага часу іншымі не заменены.

Кадр камандзіраў разьдзелаў, які ёсьць у Ворпы, да работы ня прыцягнут, а таму арганізаваным яшчэ ў 1930 годзе камсамольскім батальёнам ня было каму кіраваць і апошні амаль што разваліўся.

Культпалітасьвет, райпрафсаюз і раённы камітэт партыі ўсім не зварачаюць увагі на становішча вайсковага выхаваньня на вузьле.

Да гэтага часу ня вызначаны плянам выключныя дні для заняткаў вайсковых гурткоў, а таксама ня вызначаны актывісты Асоавіяхіму ад іншых нагрузак.

Агляд мясцовай прамысловасьці

Выявіць „вузкія месцы", ліквідаваць рэшткі шкодніцтва

Аб'яднанымі сіламі ЦКК-НК РСІ, ВСНГВ, ЦСПСВ і НКФ пачынаецца аглядзі становішча мясцовай прамысловасьці БССР і праверка выкананьня мясцовай прамысловасьці дырэктыў партыі і ўраду.

Мясцовая прамысловасьць, падпарадкаваная райвыканкомам і гарсаветам, за апошнія гады пішарка разьвівалася. Дырэктывы партыі і ўраду аб разгортваньні ў БССР прамысловасьці на базе мясцовага недафіцытнага сырцу знайшлі сваё значнае адлюстраваньне ў мясцовай прамысловасьці. Калі валявая прадукцыя мясцовай прамысловасьці складала ў 1928-29 годзе 15,2 мільёнаў руб., г. зн. рост супроць 1927-28 году на 45,4 проц., дык ў 1929-30 годзе прадукцыя мясцовай прамысловасьці складае 26,9 мільёнаў руб., або рост супроць 1928-29 году на 70 проц.

Рабсіла, якая складала ў 1928-29 годзе 4.632 чал. (больш 1927-28 году на 25,1 проц.) павялічылася ў 1929-30 годзе да 7.321 чал., г. зн., вырасла на 58,1 проц. Капітарысныя ўкладаньні за 1928-29 і 1929-30 г. г. і асобны квартал 1930 году дасягнулі 15 мільёнаў руб., або 62,4 проц. сумы, якая мерквалася за ўсю пяцігодку.

Разгортваньне мясцовай прамысловасьці ў 1931 годзе характарызуецца наступнымі асноўнымі паказальнікамі: валавая прадукцыя складае 67,4 мільёна руб., г. зн. рост на 160 проц., рабочая сіла вырастае да 8.191 чал. пастаянных і 7.862 сэзонных, або на 57,5 проц. і 139,4 проц. супроць 1929-30 году; капітальныя ўкладаньні запраектаваны ў памеры 11.250 тыс. руб. Прыбыткі вызначаны ў сумі 11.400 тыс. руб. Фінансаваньне зацьверджана ў суме 8.974 тыс. руб. пры ўзносах мясцовай прамысловасьці ў бюджэт адлічэньняў ад сваіх прыбыткаў у суме 8.060 тыс. руб.

У выніку **мясцовая прамысловасьць у 1931 годзе павінна даць 15,5 проц. валавой прадукцыі рэспубліканскай прамысловасьці, а па капітальных работах — 30 проц.**

Кантрольнымі лічбамі на 1931 год па мясцовай прадукцыі прадугледжана павелічэньне ў рабках звыш 40 пецаў магутнасьцю ад 1 да 2 млн. штук цэглы ў год, чарапічных заводаў магутнасьцю да 1½ млн. штук, 4 вапняных пецаў і 1 каналень, 13 торфараспрацовак. Адначасова будуць скончаны і мэханізаваны найбольш буйныя цагельні ў Гомелі, Віцебску, Бабруйску, Менску, Вобалі, Магілеве і інш.

Апошнія лічбы сьведчаць, што **мясцовая прамысловасьць зьяўляецца адным з важных сэктараў усёй народнай гаспадаркі БССР.** Між тым увага, якая аддаецца гэтаму сэктару народнай гаспадаркі як з боку цэнтральных плянавых устаноў, так і на мясцох — яўна невыстарчальная і патрабуе карэннага пералому.

Спэцыфічныя ўмовы мясцовай прамысловасьці, а іменна яе раськідванасьць, наўзнасьць у кожным раёне раду розных галін вытворчасьці, адсюль і складанасьць яе апэрацыйнага і тэхнічнага кіраўніцтва, —патрабуюць асаблівай прапрацоўкі і выразнай арганізацыі.

Агляд ставіць перад сабой мэту вывучэньня раду важнейшых пытаньняў: як выконваюцца дырэктывы партыі і ўраду аб разьвіцьці мясцовай прамысловасьці, ступень скарыстаньня мясцовых, сырцовых рэсурсаў, напрамак разьвіцьця асобных галін прамысловасьці, капітальныя ўкладаньні, іх эфэктыўнасьць і мэтазгоднасьць, ступень выкананьня пяцігадовага пляну, увязка разгортваньня мясцовай прамысловасьці з рэспубліканскай і іншымі сэктарамі народнай гаспадаркі. На грунце ўсяго гэтага будзе стаяць задача вызначэньня шляху **далейшага разьвіцьця** мясцовай прамысловасьці.

Такія пытаньні, як **плянаваньне і тэхнічнае кіраўніцтва,** формы кіраўніцтва мясцовай прамысловасьцю, інструктаж і сувязь цэнтральных устаноў з раённымі, дыфэрэнцыяваньне кіраўніцтва раённымі, арганізацыйная структура ў цэнтры і на мясцох, — гэтыя пытаньні, асабліва пасьля ліквідацыі акруг і перанясеньня цэнтру ўсёй работы ў раён, патрабуюць асаблівага вывучэньня і вырашэньня, бо якраз ад гэтага ў значнай ступені залежыць пасьпяховасьць работы мясцовай прамысловасьці. Якраз на вучастку плянаваньня, калі прыгледзецца да існуючых плянаў, відаць, што шкоднікі тут свае рукі больш за ўсё прыляжылі. Ужо зараз выяўляецца «тэхніка» шкодніцкага плянаваньня, накіраваная на дрэнне геаграфічнае разьмеркаваньне аб'ектаў мясцовай прамысловасьці, німэтазгоднасьць раду капітальных укладаньняў, амярцьвеньне капіталу, расьцяжку будаўніцтва на 2-3 гады, сьвядомае тармажэньне разгортваньня торфараспрацовак і пераводу мясцовай прамысловасьці, якая зьядае шмат вугалю і дроў, на тарфяны апал і г. д.

Тэхнічнае кіраўніцтва мясцовай прамысловасьцю таксама патрабуе карэннага пералому. Зразумела, што ўкладваць дзесяткі мільёнаў рублёў без належнага, а часамі і поўнай адсутнасьці тэхнічнага кіраўніцтва — дапусьціць нельга. Значнае месца ў аглядзе займае праверка работы саміх прадпрыемстваў, праверка ўсяго комплексу пытаньняў, зьвязаных з выкананьнем прамфінпляну.

Бязумоўна, брыгадам прыдасьцца з дапамогай усёй рабочай грамадзкасьці мощна ўдарыць па правааппартуністычных разважваньнях такога парадку, што нібы мясцовая прамысловасьць ня можа вытрымаць такой дысцыпліны, якая зараз патрабуецца, гэта ёй не пад сілу таму, што яна «адсталая» яшчэ ў параўнаньні з рэспубліканскай.

Нарэшце, пытаньне кіраўніцтва на мясцох, **удзел у рабоце мясцовай прамысловасьці райвыканкомаў,** гарсаветаў, іх сэкцый, прафарганізацый, партыйных і камсамольскіх ячэек. У гэтым напрамку, ня гледзячы на некаторы зрух, становішча да гэтага часу незадавальняючае і патрабуе перабудовы работы гэтых арганізацый сапраўды тварам да вытворчасьці.

Вось схэматычна асноўныя моманты работы, якія стаяць у сувязі з аглядам. Аб'ектамі абсьледаваньня вызначаны два буйныя камбінаты — Віцебск і Бабруйск — і 4 раёны.

Зразумела, што пасьпяховае правядзеньне такога важнага агляду залежыць ад дапамогі праверачным брыгадам з боку мясцовых органаў і ўдзелу шырокай рабочай масы прадпрыемстваў мясцовай прамысловасьці — ударнікаў, рабкораў, рэдкалегій газэт, а таксама з боку цэнтральнага друку.

ІЗАКАЎ, ЛІЎШЫЦ.

На „Дзьвіне" згублены 112 рабочых прапаноў

ГУЛЬНЯ Ў „ЛЁТО" ЗАМЕСТ ПЕРАВОДУ ЦЭХУ НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК

ПЕРАГЛЯД НОРМ І РАСЦЭНАК ЯШЧЭ НЕ РАСПАЧАТЫ

Брыгада ЦК і ЦКК КП(б)Б выяўляе вінаватых

Фабрыка «Дзьвіна» вось ужо доўгі час ня выконвае сваёй вытворчай праграмы. У першым кварталe г. г. праграма выканана на 86 проц. Красавік ня даў пералому (89 проц.), а першыя дні мая яшчэ больш паглыбілі прарыў. Прычым тэрэц ня выканана каля 60 проц. прапаноў **112 каштоўных прапаноў зусім згублены** (згубілі дырэктар па рабочых прапановах).

З 7 цэхаў на гаспадарчы разрахунак перайшоў толькі адзін часальны. Але і рабочым гэтага цэху пагражае небясьпека невыканаваньня прамфінпляну з прычыны несвячасовай дастаўкі сырцу са складу. Прастоі ў цэху дасягаюць цэлых гадзін.

Асноўная прычына зрыву пераходу на гаспадарчы разрахунак—недаацэнка гэтага пытаньня з боку фабрычных арганізацый і часткі камуністаў. Так, 4 мая быў сарваны партыйны сход, прысьвечаны пераходу фабрыкі на гаспадарчы разрахунак, з прычыны няўкі раду партыйцаў. Пасьля вызьвілася, што камуністы Іванаўскі, Раманоўскі (сакратар парт'ячэйкі № 5), Радышэўскі і інш. ня прышлі на сход таму, што **грапі ў пёто.**

Як Тросьнікаў трапіў на завод

Кампанія па пераглядзе норм і расцэнак на фабрыцы яшчэ не распачата. Пры распрацоўцы пытаньня аб пераходзе на функцыянальную сыстэму, што павінна зьнішчыць абязлічку і ўзмацніць пэрсанальную адказнасьць рабочых за машыны і варштаты, наглядаецца нейкая кансэрватыўнасьць з боку адміністрацыйна-тэхнічнага пэрсаналу.

Асабліва незадаволены функцыянальнай сыстэмай загадчык ватэрнага цэху **Тросьнікаў,** член партыі. Ён за апошнія два месяцы выпрабаваў **54 мэтады работы,** але ні адзін мэтад не ажыцьцёўлен. Гэта той Тросьнікаў, які ў стары час, калі фабрыка «Дзьвіна», дзе ён працаваў майстрам, знаходзілася ў руках прыватніка, **зьбіваў рабочых.** Цяпер ён пралез у рады партыі і кіруе цэхам. Р

ФАРМАЛЬНАЯ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА—ПА СУТНАСЬЦІ ПАДЗЁНШЧЫНА

—асноўная прычына ганебных тэмпаў сяўбы

у Мазырскім, Быхаўскім, Хойніцкім, Гарадоцкім і Коханаўскім раёнах

Недаацэнка зьдзельшчыны і яе ўліку—простая дапамога спробам кулака сарваць своячасовае выкананьне і перавыкананьне пасеўных плянаў

Зьдзельшчына— у стадыі разважаньняў

РАБОЧЫЯ ШЭФЫ—ТВАРАМ ДА ПРЫГАРАДНЫХ ГАСПАДАРАК

ВІЦЕБСК. (Наш кар.).

Сяўба ў прыгарадных гаспадарках ЦРК не разгорнута. Саўгасы «Біпева», «Янопаль» і «Парыская Камуна» яшчэ не прыступілі да сяўбы.

Віцебскі гарсавет адвёў зямлю пад прыгарадныя гаспадаркі з вялікім спазьненьнем—толькі 15 мая.

Фабрычныя арганізацыі—шэфы саўгасаў не аказываюць ніякай дапамогі, ня выконваюць сваіх сацдагавароў. Так, напрыклад—шэфы саўгасу «Парыская Камуна»—замест таго, каб штодзённа пасылаць у гаспадарку ў парадку шэфства для работы у сярэднім 170 чалавек, фактычна паслалі за 45 дзён толькі 27 чалавек.

Тытунёвая фабрыка, сьпіртазавод, дражджавы, завод, алейня і гарбарня зусім нічога не зрабілі ў справе пасылкі рабочых у падшэфныя гаспадаркі.

Камсамольцы-шэйнікі Клачкоў і Лужэўскі, накіраваныя на работу ў саўгасы, паказалі прыклады сымуляцыі. За ўвесь дзень яны зарабілі па 13 кап., тады як абед каштаваў саўгасу па 30 кап. на кожнага. Шчацінішчыкі прапрацавалі ў саўгасе «Новы шлях» усяго тры гадзіны, пасьля чаго склікалі сход і пастанавілі на галасаваньне—працаваць далей ці не. У часе сходу значная частка шчацінішчыкаў пайшла да хаты. Гэтыя факты неадзіночныя. Заводзкія арганізацыі не растлумачылі рабочым палітычнага значэньня дапамогі прыгарадным гаспадаркам у правядзеньні пасеўнай кампаніі.

На агульным фоне бязьдзейнасьці выгодна выдзяляецца завод «Чырвоны мэталіст», які праводзіць сапраўднае шэфства над сваім падшэфным калгасам, дапамагаючы яму рабочай і цягавай сілай.

Пагражаючае становішча стварылася ў прыгарадных гаспадарак у сувязі з недахватам цягавай сілы. Штодзённа не хапае больш 100 коняй. Замест патрэбных 17 трактараў працуюць толькі 5. Лёзьненская і Сіроцінская МТС, ня гледзячы на неаднаразовыя дырэктывы з боку цэнтральных арганізацый аб перакідцы ў Віцебск 12 трактараў, гэтай дырэктывы ня выканалі. Сіроцінскі райком партыі тармозіць перакідку трактараў.

Становішча паглыбляецца тым, што і тыя трактары, якія ёсьць зараз у прыгарадных гаспадарках не скарыстоўваюцца належным чынам. Трактарысты выяжджаюць на работу замест 3-х гадзін ночы у 7 гадз. раніцы.

Коні таксама дрэнна скарыстоўваюцца. У саўгасе «Парыская Камуна» з 45 коняй, з прычыны дрэннага догляду, захварэла 15 коняй. У саўгасе «Молатава» з 63 коняй не працуюць 12.

Пераход на вядзельшчыну яшчэ толькі ў стадыі разважаньняў. Нават сельгасаддзел ЦРК толькі зараз заканчвае распрацоўку норм. Рабочыя на вучастках не разьбітыя і да коняй не прымацаваны.

Бельмі дрэнна адбіваецца на ходзе пасеўнай кампаніі зьмена кіраўніцтва ў саўгасах, якая цяпер праводзіцца ў самы разгар сяўбы.

Усе вышэйпрыведзеныя факты з усёй выразнасьцю сьведчаць, што сяўба ў прыгарадных гаспадарках ЦРК знаходзіцца пад пагрозай зрыву. Гародніны замест 35 гэкт., вызначаных для засеву ў дзень, засяваюцца толькі 4 гэкт.

Трэба прыняць самыя хуткія і рашучыя меры для ліквідацыі прарываў. Рабочыя-шэфы павінны сапраўды пакарнуцца тварам да сваіх падшэфных прыгарадных гаспадарак, аказаўшы ім сапраўдную дапамогу. Вінаватыя ў зрыве сяўбы павінны быць прыцягнуты да суровай адказнасьці.

Арц. Зарубежны.

Самацёк

МАЗЫР.

Сяўба ў раёне і асабліва ў аднаасобным сэктары разгортваецца вельмі марудна. Гэта тлумачыцца тым, што раённыя ўстановы і сельсаветы не пераключыліся на аперацыйнае кіраўніцтва сяўбой.

Да гэтага часу калгасы яшчэ не атрымалі 6 тон насеньня ячменю, 26 тон гароху, 4,7 тон кукурузы, 7,6 тон сланечніку. Прычына—марудная афармленьне абазнасьцельстваў па выдачы насеньня ў крэдыт.

Паасобныя сельсаветы не стаяць на чале калгаснага руху, праяўляюць ганебную стаўку на самацёк. Кулацкай агітацыі не даецца належны адпор. У выніку — па некаторых сельсаветах адставаньне ў тэмпах калектывізацыі. Так, Антонаўскі сельсавет калектывізаван на 5,8 проц., Клінскі—на 11,5 проц., Дудзіцкі—на 11,3 проц. і г. д.

На зьдзельшчыну перайшлі 83 калгасы, але гэта толькі формальна, бо большасьць работ на вядзельшчыну не пераведзена. Райкалгассаюз ня кіруе арганізацыяй працы, пераводам на зьдзельшчыну калгасаў.

Камітэты сялянскай узаемадапамогі ня прымаюць удзелу ў правядзеньні весьнавой сяўбы.

ШЛЁПКІНА

ГАНЕБНЫМІ ТЭМПАМІ

ДРЫСА.

Сяўба па раёне разгортваецца ганебнымі тэмпамі. На 15 мая калгасамі ўзарана толькі 32,8 проц. пляну, засеяна 3,04 проц. пляну.

МТС працуе неарганізавана. Адсутнічае ўвязка ў рабоце МТС, рэйса і райкалгассаюзам. Трактары дасылаюцца ў танія калгасы, дзе яны зусім непатрэбны. У выніку—шматлікія прастоі трактараў. У калгасе імя Дзяржынскага трактары прастаялі 3 дні.

Выпрацоўка трактараў вельмі нізкая. Так, у калгасе імя Красіна 4 трактары за 4 дні ўзаралі толькі 7 гэкт. У калгасе імя Сталіна 4 трактары за 4 дні ўзаралі 30 гэкт.

Камуна імя Леніна некалькі месяцаў назад здала трактар для рамонту ў Асьвейскую МТС, але да гэтага часу яшчэ не атрымала яго.

З 56 калгасаў раёну на зьдзельшчыну пераведзена 49, але ўлік працы пастаўлен правільна толькі ў 11 калгасах.

Зараз партыйнай арганізацыяй мабілізован увесь раённы актыў для ліквідацыі недахопаў у разгортваньні сяўбы.

КРАЙЧЫК.

ТАМ, ДЗЕ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНА І ЯЕ УЛІК АДКЛАДВАЕЦЦА ДА ВОСЕНІ

Правільны ўлік зьдзельнай працы калгасьнікаў у працадзёх — рашаючы момант у замацаваньні зьдзельшчыны. Частка раёнаў ужо ўзялася за гэту справу.

Паводле вестак Калгасцэнтру, па 18 раёнах мабілізаваны на дапамогу калгасам у наладжваньні правільнага ўліку працы 544 раённыя працаўнікі, настаўнікі, студэнты і вучні сямігодак.

У той-жа час у Мазырскім, Хойніцкім, Гарадоцкім, Быхаўскім і Коханаўскім раёнах раённыя арганізацыі ня лічаць патрэбным заняцца справай замацаваньня зьдзельшчыны ў калгасах. У гэтых раёнах супакоіліся на тым, што калгасы фармальна перайшлі на зьдзельшчыну.

Сакратар Мазырскага райкому КП(б)Б т. Кудзелька адмовіўся пасылаць работнікаў з раёну на праверку і наладжаньне ўліку працы ў калгасах, заявіўшы:

— Мы людзей пасылаць ня будзем, бо ў нас амаль усе калгасы пераведзены на зьдзельшчыну.

На справе-ж гэта ня так. Калі мабілізаваныя з Менску студэнты Камвузу праверылі некалькі калгасаў, дык аказалася, што, напрыклад, у калгасе «Малыя Аўцюцісвічы» зьдзельшчына прынята, але нормы па ворыве ня выконваюцца. Калгасьнікам махачнічна запісваецца за кожны рабочы дзень адзін працадзень. Нарадаў ніякіх ня існуе. На работу калгасьнікі выходзяць толькі у 8 гадз. раніцы. Пастаянных брыгад у гэтым калгасе таксама няма.

У Хойніцкім раёне з 48 калгасаў перайшлі на зьдзельшчыну толькі 40. Улік працы праводзіцца дрэнна. Ня гледзячы на гэта, райком пастанавіў не пасылаць партыйцаў на дапамогу калгасам у гэтай справе.

У Быхаўскім раёне райкалгассаюз ня мае ніякіх вестак аб тым, як практычна ажыцьцяўляецца зьдзельшчына ў калгасах. Старшыня райкалгассаюзу тав. Лабанаў катэгарычна адмовіўся накіраваць работнікаў у калгасы, матывуючы сваё адмаўленьне тым, што «няма каго паслаць» і што па яго думцы гэтай справай «павінен займацца апарат калгассаюзу наогул». Калі камвузаўцы зьвярнуліся за дапамогаю ў райКК, там ім проста адказалі: «Едзьце ў калгасы і працуйце».

У Коханаўскім раёне па-новаму ўлік працы не вядзецца ні ў адным калгасе. У некаторых і зусім няма ўліку. Аднак, раённыя арганізацыі да справы пераходу на зьдзельшчыну і ўліку працы адносяцца зусім нядбайна, разважаючы: «зараз гэта мы ня здолеем, трэба адпягнуць да восені» і г. д. Мабілізаваныя з Менску таварышы толькі праз 2 дні дабіліся скліканьня пасяджэньня праўленьня райкалгассаюзу, дзе нічога канкрэтнага ня было вынесена па справе замацаваньня зьдзельшчыны ў калгасах.

Гарадоцкі раён да гэтага часу ня вылучыў ніводнага чалавека для праверкі і пастаноўкі правільнага ўліку зьдзельшчыны ў калгасах.

Такія адносіны да ажыцьцяўленьня важнейшай задачы партыі сьведчаць аб тым, што некаторыя раённыя арганізацыі і работнікі ўсё яшчэ праяўляюць апартуністычную недаацэнку зьдзельшчыны ў калгасах — гэтага магчымага фактара барацьбы за ўшчыльненьне тэмпаў сяўбы, за калгаснае будаўніцтва.

Б-ін.

Ад рэдакцыі: Пералічаныя у карэспандэнцыі тав. Б-іна раёны ганебна адстаюць у разгортваньні сяўбы. Паўднёвыя раёны—Мазырскі і Хойніцкі—выканалі ўсяго каля 20 проц. пасеўнага пляну, а іншыя—зусім мізэрны процант. Зразумела, што асноўная прычына адставаньня хаваецца ў фармальным пераводзе на зьдзельшчыну, г. з. у адсутнасьці зьдзельшчыны, ацэненай у працадзёх. Па такой правапартуністычнай практыцы, якая дапамагае кулаку ў яго антыкалгаснай падрыўной рабоце, неабходна бязлітасна ўдарыць. Трэба неадкладна прыняць меры да ліквідацыі адзначаных агідпасьцяй, прыцягнуўшы вінаватых да суровай адказнасьці. Зьдзельшчына бяз уліку—ня ёсьць зьдзельшчына. Гэта даволі ярка даказана ў карэспандэнцыі.

Нарэйкаўскі сельсавет калектывізован на 90 проц.

КОЙДАНАВА.

У Нарэйкаўскім сельсавеце на 10 мая з 563 гаспадарак—484—у калгасе. **Сельсавет калектывізован на 90** проц. 8 калгасаў і адна камуна ёсьць у сельсавеце. Апрача гэтага на тэрыторыі Нарэйкаўскага сельсавету арганізован вялікі сьвінагадоўчы саўгас.

69 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак аднаасобнікаў рыхтуюцца да ўступленьня ў калгас.

Пасеўная кампанія, дзякуючы добрай падрыхтоўцы, праводзіцца арганізавана. Усе калгасы на-ўдарнаму працуюць на полі. **Калгасьнікі адмовіліся ад выходных дзён да скончэньня весьнавой сяўбы.** Паміж паасобнымі калгасьнікамі і брыгадамі разгортваецца сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Усе калгасы перайшлі на зьдзельшчыну.

Аднаасобнікі з кожным днём папаўняюць калгасы.

З. Х.

ПАДПРАЎЛЕНАЯ ПАДЗЁНШЧЫНА

ВУЛА. (Наш кар.).

Слушанскі сельсавет, Вульскага раёну, завяршыў у асноўным суцэльную калектывізацыю. На 13 мая сельсавет калектывізован на 92 проц.

Зьдзельшчына ў большасьці сельсаветаў уведзена, але часамі пры яе ўведзеньні дапушчаны скажэньні, якія адмоўна адбіваюцца на далейшым гаспадарчым замацаваньні калгасаў, на разгортваньні сяўбы.

Так, у калгасе «Чырвоны змагар» была вызначана палявая брыгада з 30 аратых, якой дана заданьне за 20 дзён узараць 185 гэкт., г. зн. на аднаго чалавека ў дзень па 0,31 гэкт. Праўленьне калгасу тлумачыла зьніжэньне нормы тым, што взяла нібы раскідана дробнымі кавалачкамі па хутарох. Аднак, брыгада аратых скончыла работу за 12 дзён, выканаўшы норму ў 0,51 гэкт. у адзін дзень на чалавека.

Відавочна, што аб'ектыўныя прычыны для такога зьніжэньня норм былі беспадстаўнай выдумкай, якой з пачатку ня быў дан належны адпор.

Зараз перабіраюць бульбу. Па норме вызначана перабраць 6 цнт., выкрадоўваюць-жа 11 цэнт.

На запытаньне—чаму ўстаноўлена такая нізкая норма выпрацоўкі—кіраўнікі калгасу адказваюць: «А якая розьніца, усё роўна атрымаеш тое-ж самае».

Такім чынам, тут фактычна існуе падпраўленая падзёншчына, бо апэнкі ў працадзёх няма, няма і правільнага ўліку.

Неабходна зараз-жа ліквідаваць гэтыя скажэньні ў правядзеньні зьдзельшчыны, імкнучыся да ўстанаўленьня правільных норм і апэнкі іх у працадзёх. Парушэньне гэтага прынцыпу нельга інакш разглядаць, як апартуністычную недаацэнку зьдзельшчыны, як простую дапамогу кулаку.

А. Мікуцкі.

Ігнаруюць улік зьдзельшчыны

ВЫХАЎ

Вызначаны ўрадам і партыяй тэрмін пераводу калгасаў на зьдзельшчыну ўжо прайшоў. Між тым, Быхаўскі райкалгассаюз нават на сёнешні дзень ня ведае, як ужываецца зьдзельшчына ў калгасах раёну ў часе весьнавой сяўбы.

Старшыня райкалгассаюзу Лабанаў адносіцца да пераводу калгасаў на зьдзельшчыну апартуністычна. Брыгада камвузу, якая выехала на дапамогу раённым арганізацыям па пераводзе калгасаў на зьдзельшчыну, не атрымлівае дапамогі з боку райкалгассаюзу.

Блянкі нарадаў, формы ўліку працы ў калгасах райкалгассаюзам атрыманы, але чамусьці не дасылаюцца ў калгасы.

Неабходна пакласьці канец апартуністычнай практыцы райкалгассаюзу.

Брыгадзір

Ударную дэкаду сяўбы,

УВЯЗАНУЮ З МЕСЯЧНІКАМ ДРУКУ,

АРГАНІЗУЮЦЬ ХАЛОПЕНІЧЫ

ХАЛОПЕНІЧЫ. (Наш кар.).

Разгортваньне сяўбы на раёне выклікае масавы прыліў беднякоў і серадпякоў у калгасы. На 17 мая 2.274 гаспадаркі абяднаны ў калгасы. Раён калектывізован на 36,6 проц.

Калгасы ў асноўным закончылі ворыва над ярыну. Засеяна 15 проц. плянавай плошчы.

17 мая пры ўдзеле старшынь калгасаў і райактыву адбылося пасяджэньне раённага штабу па правядзеньні конкурсу па весьнавой сяўбе.

У раёне абвешчана ўдарная дэкада сяўбы. Райактыў выехаў у вёскі і калгасы. Выяжджаючым брыгадзірам дана заданьне арганізаваць і наладзіць выпуск насьценгазэт у кожным калгасе.

Ударная дэкада весьнавой сяўбы цесна ўвязана з месячнікам друку. Гэта значна дапаможа наладзіць работу нізавога друку і добра падрыхтавацца да ўсебеларускага зьезду рабселькораў. Увесь ход конкурсу будзе асьвятляцца ў насьценных газэтах.

Раённая парада актыву разам са штабам прыняла пастанову, каб усе калгасы і саўгасы былі ахоплены сацспаборніцтвам і ўдарніцтвам. Райвыканком вызначыў фонд у 4 тыс. рублёў для прэміяваньня лепшых калгасаў і калгаснікаў, якія з посьпехам скончаць весьнавую сяўбу.

МОР.

Бальшавіцкіх тэмпаў не здамо

Сакратару ЦК КП(б)Б—тав. ГЕЮ,
Старшыні СНК БССР—тав. ГАЛАДЗЕДУ
Старшыні Калгасцэнтру БССР—тав. МІЦЬКОВУ

Рапарт

Пад кіраўніцтвам ленінскай камуністычнай партыі і яе ЦК ВУЛЬСКАЯ партарганізацыя ў барацьбе за генэральную лінію партыі, рашуча змагаючыся з правым апартунізмам, як найбольш небясьпечным на даным этапе, і «левымі» загібамі, а таксама і прымірэньцтвам да ўхілаў, нанесла руйнуючы ўдар кулацтву і яго агентуры ў радах партыі і ў выніку дасягнула наступнага:

За час падрыхтоўкі да весьнавой сяўбы з 11 студзеня да 1 мая — тэрмінаў масавага пачатку ворыва — процант калектывізацыі павялічыўся з 20 да 28,6 проц. У перыяд ворыва калгасы прыліў узмоцніўся. На 15 мая раён калектывізован на 35,1 проц. У раёне — 86 калгасаў, у якіх аб'яднана 2.629 гаспадарак. Па шляху да суцэльнай калектывізацыі з посьпехам ідуць наступныя сельсаветы: СУШАНСКІ — 88,6 проц., СОКАРАЎСКІ — 74,5 проц., ГАРБАЦІЦКІ — 62,3, ВУЛЬСКІ — 52,1, ЗАРАЧАНСКІ — 46,3 проц.

Узарана па калгасах 3.089 гэкт., па аднаасобным сэктары — 4.635 гэкт., а разам — 7.724 гэкт., ПЛЯН ВОРЫВА ВЫКАНАН НА 58,5 ПРОЦ.

Засеяна рознымі яравымі культурамі па калгасах 1.042 гэкт., у аднаасобных гаспадарках — 2.369 гэкт., што складае 11,2 проц.
На палёх калгасьнікі працуюць з энтузіязмам.

Запэўняем, што пад кіраўніцтвам ЦК і ўраду сяўбу скончым у вызначаны тэрмін. Задачу партыі па калектывізацыі да восені на 45 проц. перавыканаем.

УКЛЮЧАЕМСЯ Ў КОНКУРС НА ЛЕПШАЕ ПРАВЯДЗЕНЬНЕ СЯЎБЫ І ЗАПЭЎНЯЕМ, ШТО БАЛЬШАВІЦКІХ ТЭМПАЎ НЕ ЗДАМО. СЯЎБУ СКОНЧЫМ У МАКСЫМАЛЬНА КАРОТКІ ТЭРМІН. Прарывы ва ўкараненьні зьдзельшчыны ліквідуем у бліжэйшыя дні.

ПРЫСТУПІЛІ ДА ПАДРЫХТОЎКІ ПРАВЯДЗЕНЬНЯ АСЕНЬНЯЙ УБОРАЧНАЙ КАМПАНІІ.

ВЫКЛІК ПОЛАЦКАГА РАЁНУ НА САЦСПАБОРНІЦТВА ПА ЛЕПШЫМ І ХУТЧЭЙШЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНІ СЯЎБЫ ПР[illegible]

РАЙКОМ КП(б)Б — СЛАВІН.
РАЙВЫКАНКОМ — ОРСІК.
РАЙКАЛГАССАЮЗ — БАГАДУЛІН.

Трактары працуюць толькі 10 гадзін у суткі

ВУШАЧЫ.

МТС не забясьпечыла ўдарных тэмпаў сяўбы.

У калгасе імя Красіна, Клінскага сельсавету, за 11 дзён работы трактар узараў толькі 4,2 гэкт. Калгас «Камбайн» пакуль прышоў трактар на конях скопчыў ворыва.

У самым вялікім калгасе раёну «Чырвоны Кастрычнік» трактары працуюць толькі па 10-12 гадзін у суткі.

Партыйныя і савецкія арганізацыі раёну мала цікавяцца працай МТС.

Ліпаўка

Выраўняць фронт будаўніцтва

Нераспарадчасьць пляну́ючых і будаўнічых арганізацый паставіла будаўніцтва бяпучаго юду пад удар. Чарговасьць поўнасьцю яшчэ не ўстаноўлена. Ударныя аб'екты не забясьпечаны матар'яламі і рабочай сілай. Работы па выробе цэглы, цэмэнту і вапны разгортваюцца недапушчальна марудныміі тэмпамі. Зьнішчыць на-хаду непаладкі, узяць пад асобны нагляд ударныя будоўлі. Павесьці жорсткую барацьбу за высокую якасьць будаўнічтва на аснове разгортваньня масавага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Генэральная лінія партыі на індустрыялізацыю краіны забясьпечыла гігантскія тэмпы капітальнага будаўніцтва як у БССР, так і ва ўсім Савецкім Саюзе. Наперакор мініміалісцкім установкам правых апартуністаў, краіна ўсё больш і больш пакрываецца рыштаваньнямі новых пабудоў, уступаюць у строй усё новыя і новыя фабрыкі, заводы, культурныя ўстановы.

Размах будаўнічых работ, нашы посьпехі на фронце капітальнага будаўніцтва можна бачыць хаця-б з таго, што асноўная будаўнічая арганізацыя БССР—Будаб'яднаньне — па аб'ёме праведзеных работ да сучаснага моманту ўжо амаль выканала сваю пяцігодку. Так, на працягу пяцігодкі павінна было быць праведзена работ на суму 98 мільёнаў рублёў, а ў 1931 годзе будзе праведзена ўжо па 94 мільёны руб.

Будаўніцтва 1931 г. па Будаб'яднаньні ў параўнаньні з мінулым годам павялічылася ў абсалютных лічбах з 26 млн. выкананых работ у [illegible] г. да 35 млн. належачых да выкананьня ў 1931 г., пры заданьні пяцігодкі на 1931 год у суме 23 млн. руб.

Але, гаворачы аб нашых вялізных дасягненьнях, мы павінны з усёй восьтрасьцю паставіць пытаньне, што мы ўсё такі ў радзе выпадкаў яшчэ не навучыліся будаваць шпарка, танна і добра, што ў рабоце будаўнічых і пляну́ючых арганізацый ёсьць буйнейшыя недахопы, якія значна зьніжаюць эфэктыўнасьць капіталаўкладаньняў, цягнуць вялікае амярцьвеньне капіталаў і г. д.

У параўнаньні з мінулым годам падрыхтоўка да будаўніцтва ў зімовы перыяд праходзіла значна лепш. У сувязі з тым, што будаўніцтва асноўных аб'ектаў было пачата ў сярэдзіне і канцы 1930 г., праектамі і чарцёжамі (за выключэньнем некаторых) усе аб'екты былі забясьпечаны поўнасьцю, і работу можна было разгарнуць 4-5 мая 1931 году.

Аднак, рад прычын, аб якіх мы ніжэй будзем гаварыць, паставіў нас у такое становішча, што будаўніцтва зараз не разгорнута і калі тэрміноза ня прыняць рашучых мер, то намечаны плян на 1931 год ставіцца пад пагрозу зрыву. У паасобных мясцох пры тым становішчы, якое стварылася, паўстае пытаньне — ці магчыма будзе наогул разгарнуць работу?

Згодна дырэктыў партыі і ўраду будаўніцтва аб'ектаў, якое пачнецца ў 1931 годзе, павінна быць у тым-жа годзе і скончана, але многія аб'екты, як відаць, скончаны ня будуць і прыдзецца часткова перанесьці работы на наступны год.

Як ня трэба плянаваць

Якія тут прычыны? Галоўная і асноўная — гэта няправільнае і некампетнае разьмеркаваньне будаўнічых матар'ялаў на будаўніцтва гэтага году. Дзяржплан, разглядаючы праграму і плян вырабу цэглы (кіруючыся заяўкамі паасобных ведамстваў), разьмеркаваў цэглу па патрэбнасьці, зусім ня лічачыся з чарговасьцю і важнасьцю таго ці іншага аб'екту, прычым разьмеркаваньне ішло настолькі марудна і было так дрэнна ўвязана з ходам падрыхтоўкі да будаўніцтва, што да пачатку сэзону Дзяржплян меў толькі магчымасьць падвесьці баланс будаўнічых матар'ялаў, чарговасьці будаўніцтва і да гэтага часу цьвёрда не ўстанавіў. У наяўнасьці ёсьць толькі паасобныя сьпісы чарговасьці нікім яшчэ не зацьверджаныя.

У рэзультаце таго, што фонды былі разьмеркаваны з вялікім спазьненьнем, аб'екты, якія павінны быць ударнымі, ня былі падрыхтаваны да разгортваньня работ, а матар'ялы разьвезены на ўсіх пабудовах, ня ўлічваючы чарговасьці, што ў выніку пакінула першачарговае забясьпячэньне ўдарных пабудоў толькі на паперы.

Мы маем такое становішча, што пабудовы, якія маюць камень, ня маюць вапны, а пабудовы, якія маюць цэглу, ня маюць каменю. Можна было разгарнуць работу на фундамантах і кладку сьцен бяз ужываньня цэмэнту, але з поваду раскіданасьці і некамплектнага разьмеркаваньня будаўнічых матар'ялаў па ўсёй сыстэме будаўніцтва, і гэта работа не разгорнута.

Для прыкладу можна ўзяць такую грубую памылку Дзяржпляну. Разглядаючы баланс вырабу цэглы, кіруючыся агульнай лічбай прадукцыі, Дзяржплян пазваніў паасобным ведамствам, што ім выдзелена паўная колькасьць цэглы, але зусім ня ўлічыў, што частка цэгелень, на прадукцыі якіх пры разьмеркаваньні Дзяржплян грунтаваўся, у сучасны момант яшчэ будуецца і што ў сувязі з няправільным разьмеркаваньнем будаўнічых матар'ялаў, гэтыя цэгельні яшчэ ня скончаны.

Будаўнічыя арганізацыі і ведамствы ў момант скончэньня тэрмінаў дагаворнай кампаніі павінны былі заключыць дагаворы на куплю прадукцыі. Гэтыя арганізацыі заключылі дагаворы і на падставе іх абазнаявалі вядзеньне работ, а фактычна пры паказаным вышэй разьмеркаваньні матар'ялаў выкананьне работ стаіць пад пагрозай.

Можна прывесьці рад фактаў зрыву праграмы па выпрацоўцы будматар'ялаў. Возьмем хаця-б Будаб'яднаньне: паводле пляну яно павінна было да 15 мая па цэгельнях вырабіць 13.000 тысяч штук цэглы (гэта колькасьць ужо разьмеркавана Дзяржпляном), але замест 13.000 тысяч штук на 15 мая зроблена ўсяго 350.000 штук. Лічба досыць пагражаючая. Гэта толькі па рэспубліканскай прамысловасьці, прадукцыя якое па ўдзельнай вазе займае 30 проц., але калі ўзяць заводы мясцовай прамысловасьці, то тут справа яшчэ горшая.

Такое-ж становішча мы маем і з іншымі матар'яламі, напрыклад, каменем.

Можна прывесьці сотні такіх прыкладаў, калі ў выніку цьвёрдалобасьці многіх арганізацый у сэнсе пераходу на палегчаныя канструкцыі работа ня рушыцца і фактычна зрываецца.

Наркампрацы саматужнічае

Мы адчуваем вялікі недахват рабочай сілы. Аб гэтым шмат гаворыць, аб гэтым пісала як цэнтральная, так і мясцовая прэса. Але і тут таксама можна канстатаваць адсутнасьць плянавай работы па забясьпячэньні будаўніцтва рабочай сілай.

Зімою Наркампрацы, разьмяркоўваючы рабочую сілу па раёнах, выдаваў парады на цагельнікаў у раёны, дзе фактычна рабочая сіла адсутнічае. Мы мелі выпадкі, калі ў адзін раён зьяжджаліся прадстаўнікі 4-5 заводаў, стваралі ажыятаж у адносінах зарплаты і пераманьвалі адзін у аднаго рабочых.

Да пачатку разгортваньня работ Наркампрацы ўсё яшчэ пераразьмякоўваў раёны. Для прыкладу можна паказаць такі факт.

Для першай цагельні Наркампрацы пяць раз мяняў раёны, забясьпячэньня рабочай сілай. У выніку няправільнай тарыфікацыі, калі рабочы за куб выкапкі зямлі на заводзе атрымлівае 1 р. 40 кап. ці 1 р. 50 кап., а рабочы на будаўніцтве — 2-3 рублі. Мы маем такое зьявішча, калі рабочыя-цагельнікі з заводаў пераходзяць на пабудовы, а рабочых для выпрацоўкі цэглы няма. Прафсаюзныя арганізацыі аддаюць невыстарчальную ўвагу гэтаму пытаньню.

З кадрамі рабочых для будіндустрыі справа ня лепшая. Нават пры наяўнасьці вышэйпаказаных недахопаў на сёнешні дзень работу можна было разгарнуць, але не хапае тысяч чорнарабочых, цесляроў і каменшчыкаў.

Плянаваньне падрыхтоўкі кадраў амаль не адрозьніваецца ад плянаваньня і разьмеркаваньня работы для заводаў будаўнічых матар'ялаў. Наркампрацы рыхтуе цесляроў, каменшчыкаў—парфэсіі больш шырокага скарыстаньня, а адсюль будаўнічыя арганізацыі як быццам павінны былі рыхтаваць рабочых больш вузкіх спэцыяльнасьцяй, напр., апальшчыкаў, арматуршчыкаў, апалубшчыкаў, бэтоншчыкаў і г. д. Але, з прычыны заблытанасьці ў гэтым плянаваньні, рад будаўнічых арганізацый пачаў рыхтаваць аналёгічныя прафэсіі, і ў сучасны момант арматуршчыкі і апальшчыкі, якія ёсьць у значнай колькасьці, поўнасьцю не выкарыстоўваюцца.

Разгарнуць выраб вапны і цэмэнту

Вапну ў Беларусь завозяць з розных месц на адлегласьці тысяч пяцёмстраў, напрыклад, з Сімферопалю, Праскурава, у той час, калі на Беларусі ёсьць вялікая колькасьць пакладаў сырцу. Калі Будаб'яднаньне разгарнула работу ў Віцебскім раёне па пабудове вапнавага заводу, які-б даў у 1931 годзе ня менш 10 тысяч тон вапны, то мясцовыя арганізацыі сваімі распараджэньнямі зьнімаюць цесьляроў з гэтага заводу, перакідваючы іх на іншыя віды будаўніцтва. У Аршанскім раёне вялікія паклады вапны, якія там ёсьць, распаўсюджваюцца надзвычай слаба. Да гэтага варта дадаць, што зараз, пры замене цэмэнту вапнай, попыт на яе яшчэ больш павялічыўся. У рэзультаце мы сталі перад фактам, што вапны не хапае.

Цэмэнту ў Беларусь завезена вельмі нязначная колькасьць. Але замест таго, каб правільна разьмеркаваць гэты цэмэнт па сапраўды ўдарных аб'ектах, цэмэнтам забясьпечваюцца дробныя бэтанітныя саматужныя заводзікі, што ёсьць у Магілеўскім, Менскім і іншых раёнах, якія вырабляюць бэтанітныя (сялянскага тыпу) каменьні, у той час, калі ў БССР, як гаворыцца, «мы ходзім па гліне», і можна было разьвіць выраб новага тыпу каменю бяз усякага ўжываньня цэмэнту.

Берагчы кожнае кілё металю

Па Будаб'яднаньні ў гэтым сэзоне патрабавалася звыш 2.500 тон жалезных балек, звыш 3.000 тон гатункованага жалеза і іншых металяў. Пры праверцы праектаў і выяўленьні прычын, якія пацягнулі за сабой спазьненьне пачатку будаўнічых работ, аказалася, што многія гаспадарчыя арганізацыі захапляліся канструкцыямі, якія патрабуюць шмат жалеза-бэтону. У выніку-ж праекты ляжаць, а будаўніцтва ня рушыцца з месца.

Для прыкладу можна ўзяць пабудову менскай абутковай фабрыкі. На яе найшло столькі жалеза і цэмэнту, што можна было пабудаваць дзьве такія фабрыкі. На заводзе «Камунар» у Менску была таксама разгорнута работа з жалеза-бэтоннымі канструкцыямі, і толькі тады, калі работа з-за адсутнасьці паказанага матар'ялу стала, тварышы дагадаліся перарабіць праект на драўляныя канструкцыі.

Тварам да цагельнай вытворчасьці

Адсутнасьць рабочай сілы прывяла да таго, што былі прапушчаны 10 дзён добрага надвор'я, якія далі-б поўную магчымасьць выраблянца 5 млн. штук сырцу. Аднак, на 15 мая наўрад ці ёсьць 1 млн. штук цэглы замест 50 млн. Такое становішча ў наяўнасьці і зараз.

На 15 мая на заводах будматар'ялу было занята ня больш 10 проц. патрэбнай колькасьці рабочай сілы, і калі ня прыняць раду тэрміновых арганізацыйных мерапрыемстваў, дык будаўніцтва застанецца бяз цэглы.

Трэба неадкладна вырашыць пытаньне аб павароце тварам да цагельнай вытворчасьці з тым, каб разгарнуць там работу. Трэба больш рацыянальна выкарыстаць рабочую сілу хаця-б у адносінах перавозкі гліны тачкамі. Для гэтага патрэбны вузкакалейныя шляхі. Мэталічныя рэйкі нам непатрэбны. Мы можам сьмела пайсьці на драўляныя рэйкі, якія могуць эксплёатавацца 4-5 год. Можна і трэба разгарнуць некалькі сотень кілёмэтраў выключна драўлянага шляху ў сувязі з дэфіцытам у мэталічных рэйках, забясьпечыўшы работы толькі цьвікамі і абрэзкамі палоснага жалеза.

Якасьць буданіцтва—асноўнае зьвяно

У мінулым сэзоне мы мелі вельмі дрэнную якасьць выкананых будаўнічых работ, з прычыны злачынна-нядбайных адносін да справы як з боку часткі тэхнічнага пэрсаналу, так і кватаргаў частка рабочых. Нядбайнасьць кіраўнікоў будаўнічых арганізацый і дырэктараў заводаў вельмі часта цягне падаражаньне будаўніцтва, нават пры нізкай якасьці. Мы маем выпадкі, калі не прадстаўляецца магчымым эксплёатаваць закончаныя пабудовы. Маюць месца нават абвалы.

Возьмем абвал даху аднаго корпусу ў Гомелі, абвал тынкаваньня ў менскім Дзяржбанку і, нарэшце, вялікі прагіб даху, які награжае абвалам у новапабудаваным кацельным корпусе заводу «Энэргія».

Чым тлумачыцца такое зьявішча, чаму мы маем такія вынікі? Пасьля праверкі раду фактаў ёсьць заключэньні, што як у Гомелі, так і ў іншых мясцох гэта атрымалася ў выніку нядбайнасьці і злачынных адносін тэхнічнага пэрсаналу да справы.

Калі мы праводзім па ўсіх прадпрыемствах сацыялістычнае спаборніцтва і сустрэчныя прамфінпляны па ўсіх паказьніках, дык на будаўніцтве гэта яшчэ не прышчапілася. Мы сустракаемся з выпадкамі, калі тэхнічны пэрсанал абвяшчае сябе ўдарным, а пасьля атрыманьня прэміі у яго на пабудове атрымліваецца абвал і цэлы рад агідпасьцяй.

Мы яшчэ сустракаемся з моцным супраціўленьнем з боку кіруючых работнікаў у адносінах калькуляцыі будаўніцтва і складаньня справаздач. Рэдка мы можам праверыць кошт тых ці іншых элемэнтаў, хаця ўсе магчымасьці для правільнага вядзеньня работ у наяўнасьці. Патрэбна толькі больш увагі. Мы зададзена паблажліва адносіліся да работнікаў, якія нам псавалі матар'ялы, наносілі вялікую страту, мы вельмі часта прывыклі расцяньваць гэта, як памылкі, не адрозьніваючы ад шкодніцтва.

Трэба рашуча палажыць канец расхлябанасьці і прыцягваць да суровай адказнасьці вінаватых. Трэба ўвесьці такі парадак будаўніцтва, каб дасягнік і прараб прымалі ад рабочых асобныя элемэнты работы таксама, як работадаўца прымае ад падрадчыка цэлы аб'ект. Аплата павінна праводзіцца толькі пасьля прыёмкі.

Неабходна, каб партыйныя, саязныя і грамадзкія арганіз

ТЭМПЫ ТРЭЦЯГА РАШАЮЧАГА ПАТРАБУЮЦЬ

поўнага выкананьня плянаў загатовак асноўных сельска-гаспадарчых прадуктаў

ДАГЭТУЛЬ НЯ ЗЬНІШЧАНЫ ВЯЛІКІЯ „ХВАСТЫ“ ПА ЎСІХ ВІДАХ ЗАГАТОВАК

Дэмабілізацыйныя настроі і патураньне кулацкім элемэнтам б'юць па забесьпячэньні прамысловасьці і рабочых цэнтраў

Ня гледзячы на сканчэньне ўсіх тэрмінаў, БССР выканала толькі 83,8 проц. пляну загатовак збожжа

Амаль паўгода прайшло з таго часу, калі скончыўся апошні тэрмін здачы збожжа. Супакоіўшыся на некаторых посьпехах у разгортваньні збожжазагатоўчай кампаніі, рад мясцовых арганізацый і загатоўчыя сыстэмы спынілі ўсякую работу вакол загатовак збожжа і цалкам аддаліся пад уладу самацёку—«збожжа само прыдзе па загатоўчыя пункты». У выніку на 11 мая плян загатовак збожжа поўнасьцю ня выкананы. Паяўнасьць дэмабілізацыйных настрояў прывяла да амаль поўнага згортваньня тэмпаў, да рэзкага зьніжэньня крывой загатовак.

Дагэтуль па збожжазагатоўчыя пункты здана толькі **83,8 проц.** гадавога заданьня. Такім чынам БССР мае запазычанасьць у 16,2 проц. гадавога пляну.

Асабліва дрэнную работу паказаў **Белкаапсаюз**, які выканаў толькі 75,8 проц. заданьня.

Бліскучы ўзор выкананьня сваіх абавязкаў перад дзяржавай, перад рабочымі цэнтрамі і Чырвонай арміяй паказалі калгасы БССР, якія выканалі 147,6 проц. гадавога пляну. У гэтым годзе калгасы здалі амаль у 9 раз больш, чым летась.

Нездавальняюча спаганяецца закантрактаванае збожжа. Усяго спагнана менш паловы—каля 43 проц. гадавога пляну. Тэмпы спагнаньня закантрактаванай прадукцыі характарызуюць лічбы наступленьня збожжа за апошнія дэкады: за трэцюю дэкаду красавіка паступіла адна тона, за першую дэкаду мая—нуль.

Адпаасобнікі ў парадку цьвёрдых заданьняў і самаабавязацельстваў здалі толькі 84,1 проц. Тут адмоўны ўплыў аказалі патураючыя адносіны да кулацка-заможных гаспадарак, якія дагэтуль ня выканалі поўнасьцю цьвёрдых заданьняў.

На апошнім месцы па здачы збожжа ідуць **саўгасы БССР,** якія выканалі менш 55 проц. гадавога пляну. За першую дэкаду мая саўгасы не здалі ніводнай тоны. У той час, як у мінулым годзе да мая месяца было ўжо здана саўгасамі звыш 2.300 тон, у гэтым годзе саўгасы загатовілі ня больш 1.600 тон.

Набліжаецца пэрыяд узмоцненай падрыхтоўкі да загатовак збожжа 1931-32 году. Да гэтага часу трэба поўнасьцю выканаць леташні плян збожжазагатовак. **Запазычанасьць БССР па збожжы павінна быць поўнасьцю ліквідавана.**

Пагрузка бульбы ў вагоны

ЖАЛАСЬЛІВЫЯ ДА КУЛАКОЎ

ШКЛОЎ.

Загатоўчыя сыстэмы Шклоўшчыны даволі нерашуча змагаюцца за выкананьне пляну ільназагатовак. На 10 мая плян па ільназалакне выканан на **58,2% па ільнасемі— на 70,7%**

Райснаб вельмі мякка адносіцца да тых загатоўчых арганізацый, якія да гэтага часу злачынна зрываюць свае заданьні і патураюць кулаку.

На радзе сельсаветаў цьвёрдыя заданьні з кулакоў не спагнаны. Асабліва бязьдзейнічаюць у гэтым напрамку **Фашчыўскі, Нічыпарскі, Гарадзецкі, Каменалаўскі, Падгальцаўскі і Зарэчна Шклоўскі** сельсаветы. Гэтыя сельсаветы жаласьлівыя да кулакоў, якія ў іх пад носам вывозяць лён на рынак, ня выконваючы цьвёрдых заданьняў.

„Бульба патрэбна нам самім“

(Ад нашага карэспандэнта)

У Крычаўскім раёне загатоўка і адгрузка бульбы зрываецца. **РАЙСПАЖСАЮЗ** паводле заданьня павінен адгрузіць 220 тон бульбы і загатовіць 184 тоны для мясцовага саўгасу. Спажсаюз накіраваў сваіх прадстаўнікоў у сельсаветы для ўзмацненьня загатовак і вывазкі. Аднак, праз некаторы час гэтыя прадстаўнікі вярнуліся ні з чым. Частка сельсаветаў катэгарычна адмовілася вывозіць бульбу. **КАСЬЦЮШКОВІЦКІ, ЗАРУБІЦКІ і МІХЕЕЦКІ** сельсаветы не прынялі заданьняў па адгрузцы бульбы, заявіўшы, што бульба патрэбна ім самім.

Такія настроі ёсьць і ў райвыканкоме. Загадчык райземчасткі тав. **ЛАЎРЭНАЎ** на запытаньне загадчыка райгандлю тав. **ВАСІЛЕВІЧА,** што робіцца райвыканкомам для ўзмацненьня адгрузкі, адказаў:

— Бульба патрэбна нам самім, адгружаць яе мы ня будзем.

У выніку гэтых месьніцкіх настрояў і апартуністычнай бязьдзейнасьці раённых арганізацый, плян адгрузкі бульбы ганебна правальваецца. **ДА ГЭТАГА ЧАСУ РАЁН АДГРУЗІЎ ТОЛЬКІ... КАЛЯ 5 ВАГОНАЎ.**

Трэба рашуча ўдарыць па зрыўшчыках загатовак і вывазкі бульбы. Кіруючыя раённыя арганізацыі павінны прыняць неадкладныя меры для максымальнага фарсаваньня адгрузкі. Дырэктыва вышэйшых партыйных і савецкіх органаў павінна быць поўнасьцю выканана.

Т.

ДАВОЛІ МАРУДЗІЦЬ

Тэрмін адгрузкі насеннай бульбы Масква, Ленінграду і Украіне скончыўся. Чацьвёрка ЦК КП(б)Б і СНК БССР катэгарычна патрабавала ад раённых арганізацый БССР максымальна фарсаваць адгрузку насеннай бульбы, ва што-б там ні стала скончыць яе не пазьней **15 мая.**

Аднак, ня гледзячы на тое, што прайшло ўжо 5 дзён пасьля вызначанага тэрміну, адгрузка насеннай бульбы яшчэ ня толькі ня скончана, але дагэтуль ідзе недапушчальна марудным тэмпамі. Вось лічбы, якія гавораць самі за сябе. **ЛЕНІНГРАДСКАЙ ВОБЛАСЬЦІ** за ўвесь час кампаніі адгружана 2.984 тоны, або 16 ПРОЦ пляну; **МАСКВЕ** — 2.912 тон, або 24,2 ПРОЦ.; **УКРАІНЕ** — 2.620 ТОН, або 67,2 ПРОЦ.

Асноўная прычына марудных тэмпаў адгрузкі насеннай бульбы — бязьдзейнасьць сыстэм Белпільнасаюзу і Белкаапсаюзу, якія, ня гледзячы на сыгналы друку і на дырэктывы партыі і ўраду, усё яшчэ працуюць па-старому, не пераключаюцца на баявыя рэйкі.

Да гэтага часу цьвёрдыя заданьні з кулацка-заможных элемэнтаў поўнасьцю не спагнаны. Паасобныя раённыя арганізацыі (**КРЫЧАЎСКІ, ХАЛОПЕНІЦКІ** і інш.) проста патураюць кулацтву, не прымушаюць іх выканаць цьвёрдыя заданьні, аб'ектыўна дапамагаюць ім сабатаваць загатоўкі і адгрузку бульбы.

Паказальныя суды над кулакамі, якія зпосна ня выконваюць цьвёрдых заданьняў па бульбе і па іншых відах загатовак, — рэдкае зьявішча.

Паўтараем, тэрмін адгрузкі насеннай бульбы скончыўся. Марудныя тэмпы работы загатоўчых сыстэм БССР тармозяць разгортваньне пасеўнай кампаніі ў Маскоўскай, Ленінградзкай вобласьцях і на Украіне. Трэба неадкладна ўзмацніць адгрузку, і ў бліжэйшыя дні скончыць яе.

Сьвіслацкі раён ня зыходзіць з чорнай дошкі

Сьвіслацкі райвыканком прыслаў у рэдакцыю зводку выкананьня пляну загатовак розных відаў с.-г. прадуктаў.

Гэта зводка сьведчыць аб **зусім нездавальняючых тэмпах** загатоўчай работы, аб вялікіх «хвастох» па ўсіх відах загатовак.

Плян загатовак **ільнавалакна** выканан на 10 мая толькі на **17 проц.** Кулацкі **сабатаж** ня зломлен. Кулакі здалі каля **40 проц.** цьвёрдых заданьняў.

За раёнам лічыцца вялікая запазычанасьць і па **збожжы—70,7** проц. гадавога заданьня пасьля сканчэньня ўсіх тэрмінаў. І тут кулакі засталіся ў даўгу — яны здалі толькі **60 проц.** заданьня.

Такі-ж малюнак і па **бульбе** — 70 проц.

Ня гледзячы на катэгарычныя дырэктывы партыі і ўраду — выканаць да 1 мая 70 проц. пляну загатовак **МЯСА,** — Сьвіслацкі раён на 10 мая загатовіў толькі 63 проц. заданьня па жывёле. Самае агіднае становішча са здачай жывёлы кулацкімі гаспадаркамі — кулакі злосна сабатуюць загатоўкі, выкашаўшы ня больш **48 проц.** цьвёрдых заданьняў.

Дрэннае становішча з **кармамі** — сена і саломы здана **50** і **72** проц. пляну. Кулакі выканалі каля **58 проц.** цьвёрдых заданьняў.

Гэтыя лічбы красамоўна гавораць аб тым, што Сьвіслацкі раён ня вытрымаў экзамэну на бальшавіцкае правядзеньне гаспадарча-палітычных кампаній, што кіраўніцтва раёну праявіла правааапартуністычную недаацэнку загатовак і не зрабіла належнага націску на кулака.

Патрэбен неадкладны і рашучы пералом!

У палоне дэмабілізацыйных настрояў

БЯГОМЛЬ. (Наш кар.). Спажывецкія таварыствы Бягомльшчыны забыліся аб **ільназагатоўках.** На хвалях самацёку яны дакаціліся да... 29-30 проц. выкананьня пляну і на гэтым супакоіліся, лічачы, што кампанія скончана. Дэмабілізацыйныя настроі захапілі і рад работнікаў райвыканкому. Ніякіх вестак аб ходзе кампаніі РВК ня мае, улік не наладжан. У РВК лічаць, што калі няма райгандлю (ільнаспектар Гаўрышчук зьнят з работы за праваапартуністычную практыку ў ільназагатоўках, а новага няма на працягу ўжо больш 2-х месяцаў), дык і загатовак ільну праводзіць няма каму.

На некаторых крамах спажывецкага таварыства ляжыць лён, які не дастаўляецца ў Бягомль па склады (Асэчынская крама), а месцамі нават гніе (Мсьціж); у некаторых калгасах («Беларусь», «Вітуніч», «Бярэзіна») ёсьць яшчэ нязьмятны лён і пяцька.

Асабліва недавыкананьне пляну назіраецца па кулацка-заможных гаспадарках. Напрыклад, у в. Макаўё, Мсьціцкага сельсавету, за кулацкімі гаспадаркамі лічыцца каля 400 кг. нязданага ільну. Ня лепшае становішча і па Асоўскім і Вітуніцкім сельсаветах.

Трэба адзначыць, што па мясцох не вядзецца рашучая барацьба з кулацкім сабатажам. Нарсуд разгледзеў толькі 2 справы злосных нядатчыкаў.

Нельга абыйсьці моўчкі і апартуністычную непаваротлівасьць райспажтаварыства, якое зусім ня цікавіцца ільназагатоўкамі.

На агульным сумным фоне вызначаецца добрая работа дамжарыцкага крамніка — батракаўдарніка тав. **Асіповіча,** які перавыканаў усе заданьні па загатоўках, дзякуючы шырокай растлумачальнай рабоце, вывешваньню чырвоных і чорных дошак, прэміяваньню здатчыкаў і ф. д. На жаль, яго работа не папулярызавана, райспажтаварыства ня лічыла патрэбным прэміяваць лепшага ўдарніка загатовак.

Райком КП(б)Б і райКК-РСІ павінны самым рашучым чынам дабівацца поўнага выкананьня пляну. **Трэба разгарнуць масавую растлумачальную работу вакол адозвы рабочых фабрыкі «Дзьвіна» і аршанскага ільнакамбінату, якая патрабавала бесьперабойнага забесьпячэньня сырцом тэкстыльнай прамысловасьці.**

В. ТЭМП.

Белкаапсаюз не дапамагае ў рабоце

ЖЛОБІН.

Ня гледзячы на тое, што Жлобінскі раён цягнецца ў хвасьце загатовак і адгрузкі бульбы, да гэтага часу ня прынята мер для ўзмацненьня кампаніі. Белкаапсаюз замест таго каб дапамагчы арганізацыям, адрывае ад гэтай работы адказных работнікаў. Так работнік Жлобінскага райспажыўсаюза т. **Каплан** быў камандыраван у Рыбчоў для пераводу спажыўкаапэрацыі на гаспадарчы разрахунак. Белкаапсаюз зусім забыўся аб неабходнасьці ўзмацніць адгрузку бульбы.

К.

Барацьба за фінплян—неадлучная частка барацьбы за пяцігодку

ФІНПЛЯН ДРУГОГА КВАРТАЛУ—ПАД ПАГРОЗАЙ

Фінорганы абавязаны ўзмацніць мабілізацыю сродкаў, забясьпечыць поўнае выкананьне пляну

Бязьлітасна ўдарыць па кулацка-заможных элемэнтах, прымусіць іх неадкладна ўнесьці ўсе плацяжы

Уся ўвага мабілізацыі сродкаў

Тэлеграма т. Галадзеда

Старшыням РВК Багушэўскага, Бабруйскага, Буда-Кашалёўскага, Вульскага, Гарадоцкага, Дубровенскага, Чырвонапольскага, Капыльскага, Лёзьненскага, Лагойскага, Расьнянскага, Рагачоўскага, Старобінскага, Сіроцінскага, Сеньненскага, Смалявіцкага, Талачынскага, Хойніцкага, Чавускага і Шклоўскага раёнаў і старшыням Менскага і Гомельскага гарсаветаў

Плян мабілізацыі сродкаў другога кварталу ў вашым раёне яўна зрываецца. Вы не ўвязалі работу па мабілізацыі сродкаў з іншымі кампаніямі, што зьяўляецца нецярпімым. Асабліва ганебна ідзе збор сродкаў па лініі рэалізацыі пазыкі, укладаў у ашчадкасы, рэалізацыі акцый Трактарацэнтру, паянакапленьня каапэрацыі, уступных узносаў калгасьнікаў. Ваша зусім нездавальняючая работа ў гэтай галіне зрывае агульны фінплян рэспублікі. Ускладаю на вас усю адказнасьць за мабілізацыю сродкаў. Прапаную прыняць рашучыя меры па забесьпячэньні поўнага выкананьня пляну ў маі і недабору ў красавіку.

Папярэджваю, што за невыкананьне пляну мабілізацыі сродкаў, якое зрывае выплаты зарплаты і будаўніцтва ў вашым раёне, будуць ужыты фінансавыя рэпрэсіі і інш. меры ўзьдзейнасьці. Чакаю адказу аб выкананьні да 1 чэрвеня.

Старшыня СНК БССР ГАЛАДЗЕД.

25 мая--другі тыраж пазыкі

Скарыстаць тыраж для далейшага разгортваньня рэалізацыі

У БССР кантрольнае заданьне па рэалізацыі пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады» выканана на 10 мая на 93,9 проц. Нездавальняюча праведзена падпіска па вёсцы. Заданьне па сельскім сэктары выканана толькі на 54,9 проц.

Вельмі дрэнна паступаюць узносы па казыках, пакуль паступіла 59,7 проц. усёй рэалізаванай сумы. Ад сельскага сэктару павінны ўжо былі поўнасьцю паступіць усе ўзносы. Між тым, паступіла... 28 проц. Гэта сьведчыць аб выключна дрэннай рабоце камсадаў і банкаўска-фінансавых устаноў на вёсцы.

25 мая ў г. Макееўка (Данбас) пачынаецца другі тыраж пазыкі «Пяцігодка—за чатыры гады». На гэты тыраж павінна быць зьвернута ўвага ўсіх пазыкатрымальнікаў, бо ім будуць разыграны ўсе абмененыя пазыкі, 3-я пазыка і «Пяцігодка—за чатыры гады».

Фінансава-банкаўскія ўстановы, камсады і прафарганізацыі павінны скарыстаць гэты тыраж для пашырэньня рэалізацыі пазыкі і для актывізацыі крэдытнай работы (праверка выйгрышаў, выдача іх на ўрачыстых сходах рабочых і калгасьнікаў). Гэта будзе лепшай агітацыяй за дзяржкрэдыт.

Да правядзеньня тыражу трэба прыцягнуць грамадзкіх інструктароў па дзяржкрэдыце, якія ёсьць пры кожным камсадзе.

Другі тыраж павінен зрабіць пералом у выкананьні пляну рэалізацыі пазыкі.

Рашуча ўзмацніць барацьбу за фінплян

Калегія Наркамфіну БССР заслухала даклад аб выніках мабілізацыі сродкаў насельніцтва за красавік. Калегія адзначыла **зусім нездавальняючы ход гэтай кампаніі.** Месячны плян мабілізацыі сродкаў выканан на **46,4** проц., плян другога кварталу — на **22,1** проц.

Па рэалізацыі пазыкі плян выканан на 48 проц., па ашчадкасе — на 34,6 проц., па паянакапленьні ў спажыўкаапэрацыі — на 39 проц., па рэалізацыі акцый Трактарацэнтру — на 15 проц.

Гэтыя ганебныя тэмпы работы ставяць пад рэальную пагрозу зрыву фінплян другога кварталу. Калегія зьвярнулася з просьбай да Наркамзэму, Трактарацэнтру і Белкалгасцэнтру прыняць рашучыя меры, якія забясьпечылі-б поўнае выкананьне пляну мабілізацыі сродкаў.

Усім раённым і гарадзкім фінаддзелам прапанавана ўжыць усе захады для ўзмацненьня мабілізацыі сродкаў для забесьпячэньня поўнага выкананьня пляну другога кварталу.

Калегія зьвярнулася да вышэйшых дырэктыўных органаў з просьбай заслухаць даклады **Лоеўскага, Пухавіцкага, Смалявіцкага, Асьвейскага, Сеньненскага і Гарадоцкага раёнаў,** якія сыстэматычна зрываюць свае пляны.

Калегія паставіла пытаньне перад **Лёзьненскім райвыканкомам** аб зьняцьці з работы загадчыка райфа — тав. **Славэка за сыстэматычны правал заданьняў** на мабілізацыі сродкаў.

Для распрацоўкі мерапрыемстваў па ўзмацненьні мабілізацыі сродкаў насельніцтва арганізавана адказная **тройка** ў складзе т.т. **Абрамсона** (старшыня тройкі), **Захаравай** і **Айзінсона.**

Ашчадкасы Барысаўшчыны бязьдзейнічаюць

БАРЫСАЎ.

Ашчадкаса Барысаўшчыны працуе недапушчальна дрэнна. Плян арганізацыі сеткі новых ашчаджас зрываецца. На прадпрыемствах Барысава ашчадкасы таксама не разгортваюць работы належным чынам. Камсамольскія ячэйкі на прадпрыемствах не дапамагаюць рабоце ашчаджас. Так, на гуце імя **Домбаля** і на фабрыцы **«Чырвоная Бярэзіна»** ашчадкасай ахоплена толькі **45 проц.** камсамольцаў.

Трэба рашуча ўзмацніць работу ашчаджас. Раённыя кіруючыя арганізацыі павінны аб гэтым паклапаціцца.

Б.

Конфэрэнцыя трох піянэрскіх арганізацый

20 мая ў клюбе мэталістаў адкрылася канфэрэнцыя 3-х піянэрскіх арганізацый: БССР, Заходняй вобласьці і Азэрбайджанскай ССР па заключэньні дагавору на сацыялістычнае спаборніцтва.

У ганаровы прэзыдыум канфэрэнцыі выбраны **Палітбюро ЦК УсеКП(б) і ЦК УсеЛКСМ, сакратар ЦК КП(б)Б тав. Гей і Максім Горкі.**

Ад ЦК КП(б)Б канфэрэнцыю вітаў тав. Курцін, ад ЦК ЛКСМБ—тав. Пацукоў. З прывітаньнямі і ганаратамі аб сваіх дасягненьнях выступілі піянэры ўсіх трох арганізацый.

Учора на канфэрэнцыі з дакладам аб удзеле дзяцей у сацыялістычным будаўніцтве **выступіў наркамасьветы БССР тав. Платун.** У спрэчках па дакладзе тав. Платуна запісалася **17** дэлегатаў.

Учора-ж пачалі працаваць наступныя сэкцыі канфэрэнцыі: па ўдзеле дзяцей у барацьбе за прамфінплян, па ўдзеле дзяцей у калгасным будаўніцтве, палітэхнізацыі і ўсеагульным абавязковым навучаньні, ваенна-фізкультурнай і інтэрнацыянальнай рабоце.

Сёньня на апошнім пасяджэньні канфэрэнцыі будзе заключан і падпісан сацдагавор трох арганізацый.

Новыя трамвайныя лініі

Гарсавет пастанавіў пракласьці ў Менску новыя трамвайныя лініі. У першую чаргу будзе праклядзена трамвайная лінія на Ляхаўку, а потым на Серабранку і Кальварыю.

Мяркуецца пусьціць у гэтым годзе прычэпныя трамвайныя вагоны.

Пабудова новага тэатру

Прэзыдыум гарсавету пастанавіў пабудаваць новы тэатр у Менску па вул. Карла Маркса супроць сквэру. Пабудова тэатру будзе каштаваць 3 млн. руб. На пабудовы тэатру будзе прыступлена ў 1932 г.

ПРАВІЛЫ ПРЫЕМУ

на вячэрні сэктар Камуністычнага ўнівэрсытэту Беларусі імя У. І. Леніна на 1931-32 навучальны год

1. Вячэрні сэктар Камуністычнага ўнівэрсытэту ставіць сваёй задачай падрыхтоўку кіруючых партыйных, камсамольскіх, савецкіх, вайсковых газэтных работнікаў, пераважна для прамысловых раёнаў БССР, галоўным чынам, для Менскай арганізацыі.

2. Вячэрні сэктар камуністычнага ўнівэрсытэту мае 5 аддзяленьняў.

1) Партыйнае — для падрыхтоўкі кіруючых кадраў партыйна-арганізацыйнай, прафэсыянальнай і масавай работы ў буйна-заводзкіх прадпрыемствах, саўгасах і калгасах.

2) Аддзяленьне вайсковага партактыву — для павышэньня марксыцка-ленінскага тэарытычнага ўзроўню старшага і сярэдняга каманднага складу ў аб'ёме скарочаных праграм ваенна-палітычнай акадэміі імя Талмачова.

3) Прапагандысцкае — для падрыхтоўкі выкладчыкаў прапагандыстаў для марксыцка-ленінскіх гурткоў, вячэрніх саўпартшкол, вячэрніх рабфакаў, тэхнікумаў і г. д.

4) Савецкае аддзяленьне — падрыхтоўвае партыйныя кадры для кіруючай працы ў савецкім апараце (з разьлікам на іх вылучэньне).

5) Яўрэйскае — для падрыхтоўкі кіруючых кадраў партыйна-арганізацыйнай, прафэсыянальнай і масавай работы ў буйна-заводзкіх прадпрыемствах, саўгасах і калгасах на яўрэйскай мове.

Пры вячэрнім сэктары КУБ'у арганізаваны курсы: а) камсамольскіх работнікаў, у задачы якіх уваходзіць падрыхтоўка кваліфікаваных камсамольскіх работнікаў буйна-заводзкіх прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў; б) курсы газэтных работнікаў, якія рыхтуюць кіруючыя газэтныя кадры для друкаваных шматтыражак і насьценных газэт фабрычна-заводзкіх прадпрыемстваў, саўгасаў і калгасаў.

Тэрмін навучаньня на ўсіх аддзяленьнях 3-х гадовы з 6 самастойнымі сэмэстрамі, а на курсах 2-х гадовы з 4 самастойнымі сэмэстрамі.

Заняткі на вячэрнім сэктары — з 6 з пал. да 10 гадзін вечара, 5 раз у дэкаду. Для таварышоў, якія працуюць у зьменах, арганізуюцца асобныя групы з вячэрнімі і дзённымі заняткамі.

Вучоба ў вячэрнім сэктары камуністычнага унівэрсытэту прыраўноўваецца да выкананьня партабавязкаў і ў адпаведнасьці з гэтым ячэйкі і бюро калектыву КП(б)Б павінны сачыць за яе выкананьнем. Камандыраваныя ў вячэрні сэктар вызваляюцца ад усіх партыйна-грамадзкіх нагрузак, апрача наведваньня партсходаў, часткова скарыстаньня партарганізацыяй (але ня больш аднаго разу ў пяцідзеньку). Катэгарычна забараняецца ячэйкам і парткалектывам без узгадненьня з бюро ГК КП(б)Б і паліторганаў часьцей пасылка і перакідка студэнтаў.

На вячэрні сэктар прымаюцца таварышы, якія адпавядаюць наступным запатрабаваньням:

1) На аддзяленьне партбудаўніцтва, прапагандысцкае, савецкае, яўрэйскае і вайсковае:

а) парстаж ня менш 2-х год. для жанчын — 1 год.

б) 3-хгадовы вытворчы стаж.

в) узрост ад 22 да 35 год.

2) На вячэрнія курсы газэтных працаўнікоў прымаюцца таварышы, якія маюць:

а) партстаж ня менш 1 году;

б) 2-хгадовы вытворчы стаж;

в) Узрост не маладзей 20 год.

УВАГА: Члены ЛКСМБ на гэтыя курсы могуць быць прыняты, маючы: а), камсамольскі стаж ня менш 3-х год; б) вытворчы стаж ня менш 2-х год; в) актыўныя працаўнікі рэдкалегій.

Кожная рэдкалегія друкаванай і насьценнай фабрычна-заводзкіх газэт павінна камандыраваць на вячэрнія курсы газэтных работнікаў ня менш 1 таварыша, узгадніўшы кандыдатуру камандыраванага з бюро ячэйкі КП(б)Б.

3) На курсы камсамольскага актыву: а) камсамольскі стаж ня менш 2-х год, пераважна членаў і кандыдатаў партыі; б) ня менш аднаго году актыўнай камсамольскай работы; в) 2-х гадовы вытворчы стаж фізычнай працы; г) узрост ад 18 да 21 году.

5. Для ўсіх паступаючых патрабуецца наступны аб'ём ведаў:

1) Па бедмове: уменьне бегла, правільна і выразна чытаць і пісаць з захаваньнем асноўных правіл пракапісу і ўменьне правільна фармуляваць (кусна і пісьмова) свае думкі;

2) Па матэматыцы: цьвёрда ведаць дзеяньні над цэлымі лічбамі, простымі і дзесятковымі дробямі, процантнае вылічэньне, прапорцыі, рашэньне задач на прапарцыянальныя велічыні.

3) Па геаграфіі: пачатковыя веды па фізычнай і палітычнай геаграфіі, уменьне арыентавацца па геаграфічнай карце.

4) Па палітычнай эканоміі — веды палітычнай эканоміі ў аб'ёме падручніка Лянцьцева «Пачатковы курс палітычнай эканоміі».

5) Па гісторыі УсеКП(б)Б: у аб'ёме падручніка Панова «Очерки по истории ВКП(б)».

6) Паступаючыя павінны таксама арыентавацца ў бягучых палітычных падзеях, правільна разумець пастановы партыйных зьездаў, канфэрэнцый і пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б (у асабліваасьці апошніх зьездаў і пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б).

6. Камплектаваньне праводзіцца калектывамі і ячэйкамі па разьвёрстцы Гаркому і Падзіваў.

Парткалектывы КП(б)Б, падзізы абавязаны скончыць камплектаваньне на пазьней 1-га ліпеня г. г.

ПАРАДАК АДБОРУ КАНДЫДАТАЎ:

1) Усе жадаючыя паступіць на вячэрні сэктар Камвузу (не пазьней 1-га чэрвеня) падаюць заявы ў бюро ячэйкі або бюро калектыву, дзе вырашаецца пытаньне аб магчымасьці дапусьціць іх у Камуніўэрсытэт. Пасьля ўсе заявы з дадаткам кароткай характарыстыкі адпаведнай парт'ячэйкі і ваенкома перадаюцца не пазьней 25 жніўня ў камісію пры ДЧА, якая к 5 верасьня накіроўвае матар'ял у адборачную камісію пры Унівэрсытэце.

1) Партарганізацыям і паліторганам неабходна разгрузіць таварышоў, прадставіўшы ня менш 3-х вольных вечароў у пяцідзенку для папярэдняй падрыхтоўкі для паступленьня ў Камвуз.

2) Прыём у вячэрні сэктар КУБ'у будзе ўтварацца з 15 да 25 жніўня, а на запатрабаваньням:

1) На аддзяленьне партбудаўніцтва, прапагандысцкае, савецкае, яўрэйскае і вайсковае:

а) парстаж ня менш 2-х год. для жанчын — 1 год.

б) 3-хгадовы вытворчы стаж.

в) узрост ад 22 да 35 год.

2) На вячэрнія курсы газэтных працаўнікоў прымаюцца таварышы, якія маюць:

а) партстаж ня менш 1 году;

б) 2-хгадовы вытворчы стаж;

в) Узрост не маладзей 20 год.

УВАГА: Члены ЛКСМБ на гэтыя курсы могуць быць прыняты, маючы: а), камсамольскі стаж ня менш 3-х год; б) вытворчы стаж ня менш 2-х год; в) актыўныя працаўнікі рэдкалегій.

Кожная рэдкалегія друкаванай і насьценнай фабрычна-заводзкіх газэт павінна камандыраваць на вячэрнія курсы газэтных работнікаў ня менш 1 таварыша, узгадніўшы кандыдатуру камандыраванага з бюро ячэйкі КП(б)Б.

3) На курсы камсамольскага актыву: а) камсамольскі стаж ня менш 2-х год, пераважна членаў і кандыдатаў партыі; б) ня менш аднаго году актыўнай камсамольскай работы; в) 2-х гадовы вытворчы стаж фізычнай працы; г) узрост ад 18 да 21 году.

5. Для ўсіх паступаючых патрабуецца наступны аб'ём ведаў:

1) Па бедмове: уменьне бегла, правільна і выразна чытаць і пісаць з захаваньнем асноўных правіл пракапісу і ўменьне правільна фармуляваць (кусна і пісьмова) свае думкі;

2) Па матэматыцы: цьвёрда ведаць дзеяньні над цэлымі лічбамі, простымі і дзесятковымі дробямі, процантнае вылічэньне, прапорцыі, рашэньне задач на прапарцыянальныя велічыні.

3) Па геаграфіі: пачатковыя веды па фізычнай і палітычнай геаграфіі, уменьне арыентавацца па геаграфічнай карце.

4) Па палітычнай эканоміі — веды палітычнай эканоміі ў аб'ёме падручніка Лянцьцева «Пачатковы курс палітычнай эканоміі».

5) Па гісторыі УсеКП(б)Б: у аб'ёме падручніка Панова «Очерки по истории ВКП(б)».

6) Паступаючыя павінны таксама арыентавацца ў бягучых палітычных падзеях, правільна разумець пастановы партыйных зьездаў, канфэрэнцый і пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б (у асабліваасьці апошніх зьездаў і пленумаў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б).

6. Камплектаваньне праводзіцца калектывамі і ячэйкамі па разьвёрстцы Гаркому і Падзіваў.

Парткалектывы КП(б)Б, падзізы абавязаны скончыць камплектаваньне на пазьней 1-га ліпеня г. г.

ПАРАДАК АДБОРУ КАНДЫДАТАЎ:

1) Усе жадаючыя паступіць на вячэрні сэктар Камвузу (не пазьней 1-га чэрвеня) падаюць заявы ў бюро ячэйкі або бюро калектыву, дзе вырашаецца пытаньне аб магчымасьці дапусьціць іх у Камуніўэрсытэт. Пасьля ўсе заявы з дадаткам кароткай характарыстыкі адпаведнай парт'ячэйкі і ваенкома перадаюцца не пазьней 25 жніўня ў камісію пры ДЧА, якая к 5 верасьня накіроўвае матар'ял у адборачную камісію пры Унівэрсытэце.

1) Партарганізацыям і паліторганам неабходна разгрузіць таварышоў, прадставіўшы ня менш 3-х вольных вечароў у пяцідзенку для папярэдняй падрыхтоўкі для паступленьня ў Камвуз.

2) Прыём у вячэрні сэктар КУБ'у будзе ўтварацца з 15 да 25 жніўня, а на запатрабаваньням:

№№ па ч.	Назва аддзелаў ад курсаў.	Агульная колькасьць мест.
1.	Партыйнае	— 120
2.	Савецкае	— 60
3.	Прапагандысцкае	— 80
4.	Курсы КСМ актыву	— 100
5.	Курсы газэтных работнікаў	— 100
6.	Аддз. вайсковага партактыву	— 120
7.	Яўрэйскае аддзяленьне	— 40
	Усяго	— 620

Разьвёрстка па ячэйках КП(б)Б КСМБ будзе ўтварацца Гаркомам.

Культпроп Менскага гаркому КП(б)Б КУЛІНЕНКА.

Рэктар Камвузу Беларусі САЕВІЧ.

Заг. Вячэрняга сэктару КУБ'у СЯМЁНАЎ.

Ударная сяўба ўзмацніла прыліў

АСІПАВІЧЫ.

Калгасы **«Прагрэс»** і **«Пабудка»** разгарнулі сяўбу.

Ударная работа калгасьнікаў выклікала ўзмацненьне прыліву. У калгас **«Прагрэс»** за час сяўбы ўступіла 7 гаспадарак, у калгас **«Пабудка»**—2 гаспадаркі. У гэтых калгасах ужываецца зьдзельшчына.

Агністы

Паведамленьні

— 24 мая, у 12 гадз. дня, у Культпропе ЦК КП(б)Б адбудзецца нарада па пытаньнях выданьня масавай тэхнічнай літаратуры. Выклікаюцца прадстаўнікі ВДВ, ЦСПСВ, т-ва «Тэхніка масам», ВСНГ, НКА, ЦК ЛКСМБ, МБІТ, прафсаюзаў чыгуначнікаў, хэмікаў, мэталістаў, будаўнікоў, гарбароў, дрэваапрацоўшчыкаў і ячэек КП(б)Б прадпрыемстваў: «Камунар», «Бальшавік». «ДА», Хлебозавод, дэпо МББ ч.

— **Дом Камасьветы.** 22 мая, у 8 гадз. веч., адбудзецца літаратурна-мастацкі вечар. Даклад—«Беларуская пралетарская літаратура ў рэканструкцыйны пэрыяд». Пасьля дакладу—выступленьне пісьменьнікаў і канцэрт. Білеты па ячэйках і ў чытальні Дому.

— **Навуковая асацыяцыя пры ЦП МСП і МК нав.-тэх. прац. мэдінстытуту** арганізуюць 22 мая, у апатам. корп. (Унів. гарадок) **дыспут «Барацьба на ідэалёгічным фронце ў мэдыцыне».** Уступнае слова праф. Кроля. У дыспуце прымаюць удзел т. т. Вальфсон Выдра, Валабрынскі, Крывіцкі і інш. Пач.—у 7 гадз. веч.

Папраўка

У пастанове СНК БССР і ЦК КП(б)Б ад 4 мая, апублікаванай на 1-й старонцы «Зьвязды» ад 19 мая за № 132, з п. 5 выпаў п. «г», у якім гаворыцца:

«г. Ільнаводчыя калгасы павінны абавязкова сеяць канопліі і ў полі».

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ.

Усе на мітынг пратэсту супроць новай правакацыі фашыстаў

Летні-тэатр саду „ПРАФІНТЭРН“

Менскі Гарком МОПР'у і Гарпрафсавет АРГАНІЗУЮЦЬ 26 мая ў 7 гадз. вечара

АГУЛЬНА-ГАРАДЗКІ МАСАВЫ МІТЫНГ ПРАТЭСТУ

СУПРОЦЬ НОВАЙ ПРАВАКАЦЫІ ПОЛЬСКАГА ФАШЫЗМУ. СУПРОЦЬ МАСАВАГА ТЭРОРУ І ЗВЫРСКІХ КАТАВАНЬНЯЎ НАД ПРАЦОЎНЫМІ МАСАМІ У ЗАХОДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Усе на абарону жыцьця палітзняволеных! Усе на барацьбу з фашызмам!

Пасьля мітынгу—вялікая мастацкая частка.

Білеты можна атрымаць у Гаркоме МОПР'у—Савецкая, 87, 2-гі паверх.

Менскі Гарком МОПР'у. Гарпрафсавет.

„Чырв. Зорка“ Пач. 7; 3-45; 10-30 — З 20 мая новы цікавы фільм УСЁ СПАКОЙНА... Драма ў 7 частках

„Культура“ Пач 1 с. у 7 гадз. — 2 фільмы ў